Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 ВЕРАСНЯ 2018 г. СЕРАДА № 175 (28791)

ЛЯЦІМ НА МАРС? 4

Аўтарытэтная пляцоўка для творчага пошуку

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям XIII Беларускага міжнароднага медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні: лічбавы парадак дня для медыяпрасторы».

«За час свайго існавання форум стаў аўтарытэтнай пляцоўкай для дзелавых зносін прадстаўнікоў СМІ краін блізкага і далёкага замежжа. Гэтае мерапрыемства дае ўнікальную магчымасць абмяняцца прафесійным вопытам і натхняе на новыя ідэі», — гаворыцца ў прывітанні.

«Сучасная медыяпрастора не мае межаў, а лічбавыя тэхналогіі адкрылі шырокія магчымасці для творчасці і далі багаты выбар крыніц інфармацыі. Таму сёння журналісцкай супольнасці неабходна засяродзіць увагу на пытаннях выканання прафесійнай этыкі і нормаў маралі — такіх жа важных, як і свабоднае выказванне сваіх перакананняў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы пажадаў удзельнікам мерапрыемства плённай працы і поспехаў у пошуку цікавых рашэнняў, здольных зрабіць медыясферу яшчэ больш прывабнай, бяспечнай і карыснай людзям.

КАРАТКА

• Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей абмеркаваў двухбаковыя палітычныя кантакты на вышэйшым і высокім узроўнях з паслом Расіі ў Беларусі Міхаілам Бабічам на сустрэчы з нагоды ўручэння ім копій даверчых грамат.

• **У Косаўскім палацы ў студзені — жніўні гэтага года колькасць турыстаў павялічылася амаль у два разы ў параўнанні з аналагічным перыядам 2017-га.**



• Цэны на кватэры ў Мінску ў жніўні дасягнулі максімуму з пачатку 2018 года.

• **Стартавалі продажы білетных пакетаў на дамашнія матчы БАТЭ ў лізе Еўропы.**

ISSN 1990 - 763X

«ХВАРОБА» АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

Фота БелТА.

Карупцыя ў гэтай сферы закранула амаль усю вертыкаль

Такое меркаванне выказаў кіраўнік дзяржавы на нарадзе аб праблемных пытаннях у сістэме аховы здароўя і кадравых назначэннях.

Беларускі лідар адзначыў, што ў медыцынскай сферы назапасіліся праблемы, якія неабходна вырашаць. Іх маштаб такі, што нельга абмежавацца новымі прызначэннямі. На жаль, пакуль надзеі кіраўніка дзяржавы на выпраўленне сітуацыі з назначэннем новага міністра не апраўдаліся.

«Усе, хто знаходзіцца ў гэтай зале, не выпадковыя ўдзельнікі. Я палічыў неабходным асабіста запрасіць кіраўнікоў, хто па сваіх функцыянальных і службовых абавязках адказвае за самае дарагое, за багацце нашай краіны — жыццё і здароўе людзей, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Акрамя таго, ахова здароўя яшчэ і значная частка эканомікі. Там працуе больш нашых грамадзян, чым у сферах транспарту і сувязі разам узятых, — каля 270 тысяч чалавек. А доля аховы здароўя ў валавым унутраным прадукце (3,2 %) не нашмат меншая, чым у будаўнічай галіны».

СТАР. 2

ГАНЧАРНАЕ БРАЦТВА

Браты Іван і Сяргей ШЭЛЕСТЫ з вёскі Гарадная Столінскага раёна ўсур'ёз узяліся за працяг спрадвечнага вясковага рамяства — ганчарства. Кожны з іх набыў сучасны ганчарны круг, і на бацькоўскім падворку, калі дазваляе надвор'е, яны разам робяць і традыцыйны посуд, і гліняныя сувеніры. Яшчэ школьнікамі Шэлесты навучыліся ў старых рамеснікаў ганчарнай справе, і цяпер іхнім рукам падуладна ўсё: замешваць гліну, выцягваць з яе розныя формы на крузе, абпальваць гатовы посуд.

Старэйшы Іван скончыў Пінскі індустрыяльны каледж, папрацаваў у аб'яднанні «Пінскдрэў», але вярнуўся ў родную вёску, стаў кіраўніком дзіцячага гуртка Цэнтра ганчарства. Сяргей працуе выкладчыкам фізкультуры ў каледжы машынабудавання, часта ўдзельнічае ў кірмашах майстроў і фестывалях, сёлета на «Славянскім базары» ў Віцебску на конкурсе ганчароў за свае работы атрымаў прызавое месца. Ён таксама падумвае заняцца толькі глінай.

А вось самы малодшы з братоў Максім (на фота ў цэнтры) яшчэ вучыцца ў школе. І ўсё-такі, калі старэйшыя збіраюцца разам, сядаюць за кругі, працуюць, Максім назірае за рухамі майстроў, сам спрабуе нешта рабіць і, вядома, дапамагае.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Карысная інфармацыя

У СЯМ'І СТУДЭНТ?

Магчыма, вы маеце права на льготы...

Пачаўся новы навучальны год, і тысячы маладых людзей запоўнілі студэнцкія аўдыторыі, рыхтуючыся грызці граніт навукі. Атрыманне вышэйшай адукацыі — гэта заўсёды немаленькія выдаткі, і многія сем'і зацягваюць тужэй паясы, каб вывучыць сваіх дзяцей, асабліва калі тыя не прайшлі «на бюджэт» і вырашылі атрымліваць адукацыю на платнай аснове. А якіх ільгот можна чакаць ад дзяржавы, калі ў сям'і ёсць студэнт?

Стыпендыі

Дзяржаўная сістэма стыпендыяльнага забеспячэння ўключае ў сябе навучальныя, сацыяльныя і спецыяльныя стыпендыі.

За высокія дасягненні ў вучобе, навуковай і грамадскай рабоце могуць прызначацца персанальныя стыпендыі савета ВНУ, імянныя, а таксама, пры асаблівых поспехах, стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Студэнтам, аспірантам, навучэнцам установ сярэдняй спецыяльнай адукацыі могуць устанаўлівацца надбаўкі за асаблівыя поспехі ў вучобе, грамадскай і навуковай рабоце, а таксама аказвацца матэрыяльная дапамога са сродкаў стыпендыяльнага фонду.

СТАР. 11

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«ХВАРОБА» АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах кіраўніка дзяржавы, апошнія паўгода ўсё грамадства было ўзрушана становішчам спраў, якое склалася ў медыцыне. Учора на нарадзе Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што з мінулага года яму стала паступаць інфармацыя аб тым, што колькасць спраў карупцыйнага характару ў медыцыне рэзка ўзрасла — амаль у два разы. «На жаль, факты карупцыі здараюцца ўсюды, але ў ахове здароўя праблема стала не кропкавай, а скразной, як некаторыя казалі, сістэмнай. Яна закранула не асобных чыноўнікаў, а практычна ўсю вертыкаль — ад прыватнікаў, ваенных, дзяржслужачых да Міністэрства аховы здароўя, а можа быць, і вышэй — следства разбярэцца, — сказаў беларускі лідар. — Мною была пастаўлена прынцыповая і цвёрдая задача: не знайсці «стрэлачнікаў», а літаральна выкарчаваць гэтую заразу дашчэнту, дакапацца да галоўных арганізатараў гэтага беззаконня».

Самае важнае, паводле слоў Прэзідэнта, — выявіць перадумовы і прычыны, якія прывялі да завядзення крымінальных спраў, дзе фігуруюць дзясяткі мільёнаў долараў злачынных сродкаў.

Вынікі несуцяшальныя: амаль 100 чалавек трапілі пад следства. «Пакуль», — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што суд вызначыць, хто і наколькі вінаваты, але выкрытыя факты сумненняў не выклікаюць.

Ён таксама адзначыў, што пры ўсёй маштабнасці аператыўных мерапрыемстваў Камітэт дзяржаўнай бяспекі спрацаваў спакойна і акуратна. На яго думку, іншым сілавікам трэба браць прыклад з таго, як можна забяспечваць выкананне законаў і пры гэтым не шкодзіць эканоміцы і невінаватым работнікам.

«Я хацеў, каб усе ведалі гэтую інфармацыю і не было нараканняў: «Навошта так жорстка?» Некаторыя так разважаюць. Але гэта здароўе людзей, і гэта вялікія грошы, якія мы ўкладваем і якія сёй-той вырашыў прысвоіць праз цэны на медтэхніку і лекі», — дадаў беларускі лідар.

Менш за ўсё кіраўнік дзяржавы хоча, каб гэтыя гучныя правапарушэнні негатыўна паўплывалі на стаўленне грамадства да айчыннай аховы здароўя. Такія выпадкі ні ў якай меры не павінны кідаць цень на сумленных і прыстойных урачоў, якіх у нас большасць.

Таму Прэзідэнт запатрабаваў адкрыта абмеркаваць на нарадзе праблемныя пытанні медыцынскай сферы, вызначыць шляхі іх вырашэння і прадметна паставіць задачы на перспектыву. Ён падкрэсліў: ніхто не павінен быць пакараны дарэмна, і падазраваць ніхто не можа чалавека невінаватага. «Але таго, хто заблытаўся ў карупцыйнай павуціне, мы адтуль выцягнем і прызначым туды, дзе ён павінен быць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Слова міністру

Міністр аховы здароўя Валерый Малашка заявіў, што сістэма аховы здароўя выбудавана, працуе стабільна і выконвае свае задачы. Разам з тым за праблемы, якія назваў Прэзідэнт, міністэрства і асабіста міністр нясуць поўную адказнасць, пацвердзіў Валерый Малашка.

Паводле яго слоў, з'яўленню карупцыі спрыялі самазаспакоенасць ад станоўчых вынікаў, залішняя асцярожнасць пры прыняцці рашэнняў, працягласць працэдур закупак, нядобрасумленнасць асобных кіраўнікоў і закупнікоў.

Міністр аховы здароўя лічыць адной са сваіх задач зрабіць медыцынскую дапамогу недарагой для дзяржавы. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, якім чынам гэта можна зрабіць пры створанай карупцыйнай сістэме закупак лекаў і медыцынскай тэхнікі. Валерый Малашка адказаў, што найперш неабходна ліквідаваць перадумовы карупцыі. Для гэтага праведзена маштабная работа ў змене заканадаўства. Кіраўнікам установаў дадзена вялікая самастойнасць пры набыцці лекаў і тэхнікі. Асаблівая ўвага ўдзелена адбору кіраўнікоў, узмоцнены кантроль за адсочваннем цэн, працэдур закупак.

У цэлым усе свае намаганні міністэрства накіруе на тое, каб працэдуры дзяржаўных закупак былі празрыстымі і зразумелымі, запэўніў Валерый Малашка. Сёння работа камісій па закупках транслюецца ў інтэрнэце.

Другая праблема, якую вылучыў міністр аховы здароўя, — гэта забеспячэнне даступнай і якаснай медыцынскай дапамогі для зніжэння захваральнасці і смяротнасці ад неінфекцыйных хвароб. Па словах чыноўніка, для гэтага змяняецца работа першаснага звяна. У цэнтры ўвагі — здаровы пацыент і прафілактыка, дыспансерызацыя. Да 2021 года будзе ўкаранёны інстытут урача агульнай практыкі, заканадаўча прапрацоўваецца ўвядзенне дня здароўя, каб пацыент за дзень, які дае наймальнік, прайшоў дыспансерызацыю і ўсе неабходныя абследаванні.

У міністэрстве падлічылі, што калі людзей з высокай рызыкай інфарктаў і інсультаў будуць забяспечваць лекамі са зніжкай у 50 %, а да гэтага дадасца лячэнне ў дзённых стацыянарных паліклініках, то гэта будзе каштаваць як мінімум у тры разы танней, чым лячыць іх пазней у бальніцы. Усе неабходныя прэпараты — айчынныя.

Што датычыцца павелічэння сярэдняй працягласці жыцця, то Валерый Малашка адзначыў, што да вырашэння праблемы варта прыцягваць іншыя галіны — харчовую напрыклад. Яшчэ адна праблема — рост патрэбы ў новых відах і аб'ёмах медыцынскай дапамогі. Стаж працаздольнага ўзросту расце, а значыць, павялічваецца колькасць хранічных паталогій, на барацьбу з імі патрэбныя лекі. З мэтай падтрымкі айчынных вытворцаў прапрацоўваецца пытанне гарантаванай закупкі на працягу трох гадоў імпартазамяшчальных прэпаратаў нашых прадпрыемстваў. Вядзецца работа і над павелічэннем экспарту.

Акрамя таго, па словах Валерыя Малашкі, неабходна карэнным чынам змяніць сістэму кантролю якасці медыцынскай дапамогі, ужо распрацаваны новыя крытэрыі. Дарэчы, распрацоўваецца цэнтральная сістэма электроннай аховы здароўя, якую могуць запусціць ужо ў 2021—2022 гадах.

Адказ Прэзідэнта

Па завяршэнні дакладу Валерыя Малашкі кіраўнік дзяржавы выказаў сумненне ў тым, што той знаёмы з расследаваннямі ў медыцынскай сферы. «Вы лічыце, гэта нармальна? Я задаў пытанне: чаму гэта стала магчымым? — спытаў беларускі лідар. — Вось вы растлумачце, каб людзі вас сёння пачулі і зразумелі прычыну. Сітуацыя склалася так: сотня нягоднікаў трапіла пад следства, але ж працуе 270 тысяч. І пляма на іх усіх лягла. У чым вінаватыя тыя людзі, якія сумленна выконваюць свой абавязак?»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што пры назначэнні звярнуў увагу Валерыя Малашкі на карупцыйны складнік, а таксама запатрабаваў вывучыць сітуацыю з цэнаўтварэннем. Пазней яму было даложана, што ўсё ў парадку. Але ж па факце даручэнні не былі выкананы.

Валерый Малашка прызнаўся, што апраўдвацца тут няма чым, яму сорамна. Па словах міністра, яму цяжка растлумачыць паводзіны такіх кіраўнікоў, але разам з тым сістэму плануюць мяняць, зрабіць усё максімальна празрыстым.

«Валерый Анатольевіч, гэта ж у вас пад носам. Ну вы куды глядзелі? — зноў спытаў Аляксандр Лукашэнка. — Бо там затрыманыя непасрэдна вашы падначаленыя. Вы мне так вось шчыра скажыце, вы здольныя кіраваць міністэрствам? Бо калі вы не здольныя, далей будзе горш».

У адказ міністр аховы здароўя пабяцаў, што зробіць усё, каб выправіць недахопы і каб сістэма працавала стабільна. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што пахвала міжнародных арганізацый закружыла галаву, таму ў міністэрстве перасталі звяртаць увагу на скаргі людзей, чэргі ў паліклініках, хамства з боку ўрачоў. Ён параіў Валерыю Малашку вывучыць водгукі ў інтэрнэце — па іх можна ацаніць работу сферы. Паводле слоў Прэзідэнта, глабальныя поспехі — гэта выдатна, але размова ідзе пра звычайных людзей.

Пытанне пра тое, як такое магло адбыцца, Аляксандр Лукашэнка задаў і першаму намесніку міністра аховы здароўя Дзмітрыю Піневічу.

На думку апошняга, быў аслаблены кантроль, недаглядзелі за арганізацыямі, якія ажыццяўлялі закупкі, экспертызу якасці. Не змаглі наладзіць сістэму аб'ектыўнага экспартнага кантролю. Не было ясна, што рабіць з афіляванымі кампаніямі, у заканадаўстве гэта не было замацавана. Ён адзначыў, што сёння пры закупках неабходна мець некалькі меркаванняў, цэнтраў, каб не было ўзгодненых пазіцый, паколькі гэта нясе ў тым ліку карупцыйную рызыку. Ён запэўніў, што ўсе найбліжэйшыя аўкцыёны і конкурсы будуць весціся ў ручным рэжыме.

Фінальнае слова было за беларускім лідарам: «Не дай бог мне даложаць хоць найменшую зачэпку па персаналіях, па кіраўніцтве Міністэрства аховы здароўя. Я буду настойваць на тым, каб памножылі на тры. Мінімум атрымаеце каэфіцыент тры. Калі дзесьці паблажка камусьці будзе, то вам будзе павелічэнне».

Пачатак наступнага года — да гэтага часу цяперашняе кіраўніцтва аховы здароўя абавязана вырашыць праблемы. У пачатку 2019-га адбудзецца новая вялікая размова на гэтую тэму.

Па выніках нарады Прэзідэнт даў згоду на назначэнне шэрагу кіраўнікоў у сферы аховы здароўя. На пасаду намесніка міністра аховы здароўя ўзгоднены Барыс Андрасюк.

Мікалай Кудзяньчук узгоднены на пасаду генеральнага дырэктара вытворча-гандлёвага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белмедтэхніка».

На пасадзе генеральнага дырэктара гандлёва-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белфармацыя» будзе працаваць Валянціна Ігнаценка.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

ВУЧЫЦЦА КАРЫСНА

Беларусь хоча бліжэй пазнаёміцца з вопытам Савета Еўропы па мясцовым самакіраванні

Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы Гудрун Мослер-Цёрнстром.

У пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы павітаў старшыню кангрэса ў Беларусі і падзякаваў ёй за візіт у «гэты цудоўны восеньскі час». На яго думку, вельмі важна, каб яна пазнаёмілася з Беларуссю і Мінскам, каб мець уласнае ўражанне пра краіну.

«Мясцовае самакіраванне, кіраванне рэгіёнамі — гэта вельмі важная ў сучасным свеце тэма. І тое, што Савет Еўропы ўдзяляе гэтаму вялікую ўвагу, дарагога варта. І мы хацелі б бліжэй пазнаёміцца з вашым вопытам, таму цесна супрацоўнічаем з кангрэсам», — падкрэсліў беларускі лідар.

Паводле слоў Прэзідэнта, круглы стол па праблематыцы мясцовага самакіравання, які верхняя палата беларускага парламента разам з Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы правядзе 12 верасня ў Мінску, прынясе пэўную карысць не толькі Беларусі, але і Еўропе ў цэлым, а таксама самой арганізацыі.

ДАВЕДКА

Кангрэс мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы — кансультатыўны орган Савета Еўропы, які прадстаўляе мясцовыя і рэгіянальныя ўлады еўрапейскіх дзяржаў. Налічвае 324 члены ад больш чым 200 тысяч адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак 47 дзяржаў.

«Я хацеў бы вас запэўніць, падзякаваўшы за магчымасць арганізаваць у Мінску падобнае мерапрыемства, што мы зробім усё для таго, каб яно было паспяховым, і выканаем любое ваша пажаданне, якое ўзнікне па ходзе правядзення гэтага мерапрыемства», — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што ў Беларусі ёсць пэўны вопыт міжрэгіянальнага супрацоўніцтва з Расіяй, Украінай у рамках трансгранічных праграм, а таксама з краінамі Балтыі. Прэзідэнт нагадаў, што восенню ў нашай краіне адбудзецца два буйныя мерапрыемствы: сустрэча кіраўнікоў рэгіёнаў Расіі, а потым Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны. Кіраўнік дзяржавы запрасіў старшыню кангрэса на гэтыя мерапрыемствы, каб убачыць вынікі рэгіянальнага супрацоўніцтва.

Старшыня кангрэса выказала ўпэўненасць, што круглы стол будзе паспяховым. «Для нас гэта толькі пачатак у нашых прадукцыйных адносінах у галіне мясцовага самакіравання», — дадала яна.

Старшыня кангрэса падзякавала за дапамогу ў арганізацыі сустрэчы Савету Рэспублікі ў цэлым і яго старшыні, а таксама адзначыла адкрытасць зносін. На яе думку, семінар стане карысным і для кангрэса. «Мы сапраўды гатовыя вучыцца ў вас. Я веру, што мы можам вучыцца адно ў аднаго», — заявіла Гудрун Мослер-Цёрнстром.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

❍ У тэму

Раней са старшынёй Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы сустрэўся старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч, паведаміла БелТА. Парламентарый адзначыў, што ў апошнія гады работа з СЕ, ЕС і ў цэлым з аб'яднанай Еўропай актывізавалася, таму трэба зрабіць усё, каб гэтыя пазіцыі замацаваць і развіваць.

Ён таксама заявіў, што бакі нядрэнна рушылі наперад у супрацоўніцтве ў сферы мясцовага самакіравання.

■ Форум рэгіёнаў

Нас чакае Тыдзень інтэграцыі

Ён пройдзе напярэдадні пятага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі

Падчас гэтага тыдня Магілёўская вобласць будзе прымаць дэлегацыі і правядзе савет дзелавога супрацоўніцтва. Акрамя таго, запланаваны злёт студэнцкіх атрадаў і маладзёжная спартакіяда.

«Маладыя людзі будуць задзейнічаны ў рабоце ўсіх секцый, каб абмяркоўваць прыярытэты будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Пройдзе цікавы маладзёжны форум з удзелам дэлегацый з розных рэгіёнаў дзвюх дзяржаў. Чакаецца адкрыты дыялог, падчас якога мы падвядзём вынікі супрацоўніцтва і паставім задачы на сяроднетэрміновую перспектыву», — адзначыла **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна ШЧОТКІНА** на пасяджэнні беларускага і расійскага арганізацыйных камітэтаў па падрыхтоўцы і правядзенні форуму ў Магілёве. Было абмеркавана, што, калі ў горадзе не хопіць месцаў у гасцініцах, будуць задзейнічаны магчымасці Шклоўскага, Чавускага і іншых суседніх раёнаў.

Надзея АНІСОВІЧ

■

■ Тры пытанні да ўлады

БАГАТАЯ ГІСТОРЫЯ, ДОБРЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Са старшынёй Талачынскага райвыканкама Сяргеем ЯГОРАВЫМ карэспандэнт «Звязды» сустрэўся ў дзень святкавання 585-й гадавіны горада. У раёне напярэдадні «імянін» райцэнтра адкрыўся сучасны сельскагаспадарчы комплекс. Літаральна на вачах актыўна развіваецца манастыр, якому ахвяруюць нават зоркі эстрады. У мясцовай улады шмат цікавых ідэй наконт таго, як зрабіць горад і раён больш утульнымі для тутэйшых і прывабнымі для турыстаў. Пра гэта расказаў кіраўнік мясцовай улады.

— Добрым падарункам раёну стала афіцыйнае адкрыццё прадпрыемства па вырошчванні беконнай свініны, якое адпавядае еўрапейскім стандартам. Сярэдняя зарплата, па словах прадстаўніка інвестара, на ўзроўні 1500 рублёў у месяц. Што прынесла раёну рэалізацыя гэтага праекта?

— Замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Белдан» пачало фінансаваць будаўніцтва тры гады таму. Тэхналагічная вытворчасць распачалася пазалетась. Паэтапна было запланавана здаць пад ключ чатыры пускавыя комплексы. Сума інвестыцый — каля 62 мільёнаў рублёў. Было створана больш за 40 рабочых месцаў. Вытворчая магутнасць вырабу беконнай свініны — больш за 55 тысяч галоў, а гэта — 6000 тон мяса ў жывой вазе ў год. Свінак для развядзення прывозяць з Даніі. Паралельна вырошчваюць збожжавыя...

Безумоўна, для раёна наяўнасць такога прадпрыемства вельмі важны фактар. Яно ўжо паспяхова працуе, а афіцыйнае адкрыццё — знакавая падзея. Зразумела, што такое эфектыўнае прадпрыемства будзе спрыяць умацаванню эканомікі раёна, дапаможа вырашыць сацыяльныя пытанні. Напрыклад, для работнікаў запланавана пабудаваць каля дваццаці катэджаў.

— Сяргей Валер'евіч, для ганаровых гасцей святкавання юбілею Талачына арганізавалі і экскурсію ў манастыр. Гэты комплекс — духоўная здраўніца, куды прыязджаюць мноства людзей з розных краін. Ці ёсць планы наконт таго, як зрабіць гэта месца яшчэ больш прывабным для турыстаў?

— Насамрэч па бласлаўленне і вылячэнне душы і цела ў Свята-Пакроўскі жаночы манастыр райцэнтра прыязджаюць здалёк.

Ігумення матушка Анфіса, каб даведацца пра гісторыю, шмат працавала ў архівах розных краін. Высветліла, што, калі Талачын належаў Льву Сапегу, канцлеру Вялікага Княства Літоўскага, ён у 1604 годзе заснаваў тут драўляны касцёл. З часам будынак перабудавалі, але рэшткі сцен і фундамента захаваліся да нашых дзён. І ў 1804 годзе касцёл быў ператвораны ў праваслаўную царкву. Зараз яна — упрыгажэнне Свята-Пакроўскага жаночага манастыра. Гэта адна з архітэктурных жамчужын на тэрыторыі былога СССР. Унікальнасць у тым, што ў часы позняга віленскага барока была створана адзіная на тэрыторыі сучаснай Беларусі царква з двухвежавым фасадам.

Побач у двухпавярховым будынку захаваўся келейны пакой, дзе спыняўся Напалеон.

Матушка стала ініцыятарам узвядзення капліцы, стварыла купальню... Паводле яе слоў, ёсць факты, калі нават людзі з хранічнымі хваробамі вылечваюцца ў крынічнай вадзе.

У планах, а іх шмат, — адкрыццё духоўна-асветніцкага цэнтра, пякарні, трапезнай для прыезджых, «Дзіцячага гарадка» з кафэ...

— «Звязда» ўжо паведамляла, што на святкаванні прэзентавалі скульптуру Талакі, ёсць намер стварыць музей пад адкрытым небам на тэрыторыі Друцкага гарадзішча. Што яшчэ зроблена і плануецца?

— Добраўпарадкавалі адзін з найстарэйшых у краіне паркаў — «Юзафполле», які знаходзіцца на ўскрайку райцэнтра. Налета запланавалі добраўпарадкаваць берагі ракі Друць, якая працякае праз Талачын. Для таго каб рэалізаваць задуманае, выкарыстаем грошы, зароблены падчас суботнікаў.

Для тых, хто за здаровы лад жыцця, прадугледжваецца стварэнне вулічнага комплексу з трэнажорамі для заняткаў фізкультурай.

Ёсць і іншыя цікавыя ідэі, якія, упэўнены, калі будуць рэалізаваныя, спадабаюцца тутэйшым і гасцям.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Парламенцкі дзённік

На падыходзе змяненні ў Працоўны кодэкс

Яны датычацца прадаўжэння кантрактаў, часовага пераводу да другога наймальніка, дыстанцыйнай працы і іншага. Рабочая група Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях сабралася, каб разгледзець больш за 50 прапаноў адносна новаўвядзенняў у заканадаўства. Палова з іх ад дэпутатаў, астатнія ад Федэрацыі прафсаюзаў, ад Саюза прадпрымальнікаў, ад іншых грамадскіх арганізацый і навуковай супольнасці.

Як расказвае **Тамара КРАСОЎСКАЯ, старшыня профільнай камісіі,** зараз ідзе досыць напружаная падрыхтоўка да восеньскай сесіі, на якой будзе разгледжаны гэты законапраект у другім чытанні. Многія прапановы заслугоўваюць увагі, і яны ўжо падтрыманы распрацоўшчыкамі. Дэпутаты выступаюць за больш дакладнае прапісванне некаторых момантаў у Працоўным кодэксе. Напрыклад, дыстанцыйная праца — гэта складаныя прававыя адносіны з пункту гледжання працоўнага права. І яны патрабуюць большай вызначанасці.

Надзея АНІСОВІЧ

■

КІРУЮЧЫСЯ ПРЫНЦЫПАМ АДКРЫТАСЦІ

Ва Узброеных Сілах гэтымі днямі праходзяць камандна-штабныя вучэнні. Сёлета яны з'яўляюцца фінальным этапам у сістэме баявой, аператыўнай і мабілізацыйнай падрыхтоўкі войскаў. Іх тэма ставіць за мэту падрыхтоўку і выкарыстанне сіл для адбіцця агрэсіі супраць нашай краіны.

Фінальны этап вучэнняў распачаўся на Барысаўскім палігоне 11 верасня.

— Перад вайскоўцамі была пастаўлена задача знішчыць аэрамабільны дэсант праціўніка сіламі падраздзялення 19-й асобнай механізаванай брыгады з баявой стральбой, — зазначыў **камандуючы войскамі Паўночна-Заходняга аператыўнага камандавання генерал-маёр Андрэй ЖУК.** — Агнявую падтрымку забяспечвалі артылерыйскія падраздзяленні. Вялікае значэнне мы надалі тылавому і медыцынскаму забеспячэнню. Пастаўленыя задачы былі выкананы. За вучэннямі сачылі аташэ і назіральнікі амаль з 20 краін свету.

— Камандна-штабное вучэнне Узброеных Сіл, якое зараз праводзіцца, не падпадае пад катэгорыю назіранага ў адпаведнасці з палажэннямі Венскага дакумента 2011 года, — паведаміў **начальнік упраўлення верыфікацыі Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва Міністэрства абароны Беларусі Андрэй ЦАРЫК.** — У той жа час мы хочам прадэманстраваць сваю адкрытасць, прыхільнасць прынцыпу ўзаемнасці. Таму Беларусь запрасіла для назірання за гэтым вучэннем вайсковых назіральнікаў з суседніх краін, у прыватнасці з Латвіі, Літвы, Украіны. Ад кожнай з краін прыехалі па два прадстаўнікі. Да іх дадаліся 15 аташэ.

— Я вельмі рады, што магу паглядзець на актыўную фазу асноўнага этапу камандна-штабнога вучэння, — сказаў **ваенны аташэ Рэспублікі Балгарыя ў Беларусі палкоўнік Станіслаў ГЕНКАЎ.** — Мы пабачылі разнастайныя баявыя дзеянні па ўтрыманні абарончага рубяжа і знішчэнні праціўніка, а таксама авіяцыйную і агнявую падтрымку. Узровень зладжанасці вельмі высокі. Нягледзячы на тое, што вучэнне было неназіранае, я і мае калегі — аташэ з іншых краін — былі запрошаны сюды. За гэта ад свайго імя і ад імя ўсіх сваіх калег дзякую кіраўніцтву Узброеных Сіл Беларусі.

Камандаваў вучэннямі начальнік Генеральнага штаба — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег Белаконеў. Ён уручыў ваеннаслужачым, якія вызначыліся найлепшым узроўнем падрыхтоўкі, памятныя падарункі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Расіі пачаліся вучэнні, у якіх удзельнічаюць 300 тысяч вайскоўцаў

У Расіі пачаліся самыя маштабныя з 1981 года ваенныя вучэнні. У манеўрах пад назвай «Усход-2018» задзейнічаны амаль 300 тысяч вайскоўцаў. «Усяго да манеўраў прыцягнута больш за тысячу самалётаў, верталётаў і беспілотных лятальных апаратаў, да 36 тысяч танкаў, бронетранспарцёраў і іншых машын, да 80 караблёў і суднаў забеспячэння», — заявілі ў міністэрстве абароны. На вучэннях пакажуць прынцыпова новыя злучэнні ПДВ. Агульная колькасць ваеннаслужачых у расійскіх узброеных сілах складае каля аднаго мільёна чалавек. Такім чынам, у вучэннях прымае ўдзел амаль трэць арміі РФ. Манеўры працягнуцца да 17 верасня на тэрыторыі і ў марскіх акваторыях Далёкага Усходу Расіі. Мэта манеўраў — адпрацоўка прымянення міжвідавых вайсковых груповак. У манеўрах возьмуць удзел кітайскія і мангольскія вайскоўцы.

Надзвычай небяспечны ўраган «Флорэнс» рухаецца на ЗША

Чакаецца, што ўраган абрынецца на горад Уілмінгтан, што ў Паўночнай Караліне, познім вечарам у чацвер. Ёсць апасенні, што «Флорэнс» можа стаць самым разбуральным ураганам у дадзеным рэгіёне за апошнія 30 гадоў. «Ён імкліва набірае сілу. Яшчэ ў панядзелак раніцай яго ацэньвалі як трохбальны, але ўжо праз гадзіну скорасць ветру павялічылася са 178 да 195 кіламетраў за гадзіну, а ацэнка патэнцыйнай шкоды выросла да чатырох балаў — гэта значыць урагану такой сілы, падчас якога дрэвы будуць паваленыя, зборныя дамы разбураныя, а ў каменных будынкаў будуць пашкоджаны вокны, дзверы і дахі. Зона затаплення пры ўрагане чацвёртай катэгорыі распасціраецца да чатырох кіламетраў углыб сушы. Метэаролагі мяркуюць, што па меры таго, як ураган набірае моц у цёплых водах Атлантыкі, ён можа дасягнуць найвышэйшай, пятай, катэгорыі. Эвакуіраваць трэба будзе звыш мільёна чалавек, у тым ліку жыхароў, служачых і турыстаў. Дональд Трамп ужо падпісаў указы аб аб'яўленні надзвычайнага становішча ў Паўночнай і Паўднёвай Караліне і абмеркаваў сітуацыю з губернатарамі гэтых штатаў.

«Сабібор» Канстанціна Хабенскага вылучылі на «Оскар»

Фільм Канстанціна Хабенскага «Сабібор» вылучаны расійскім оскараўскім камітэтам на атрыманне прэміі ў катэгорыі «Найлепшы фільм на замежнай мове». Карціна вылучана большасцю галасоў. «Сабібор» стаў рэжысёрскім дэбютам Хабенскага, да таго ж акцёр выканаў у ім галоўную ролю. У фільме таксама зняліся Крыстафер Ламберт, Міхаліна Альшанскі, Філіп Рэйнхарт і Марыя Кажэўнікава.

Карціна знятая па матывах кнігі Ілы Васільева «Аляксандр Пячэрскі: прарыў у неўміручасць». У ёй расказваецца пра тое, як лейтэнанту савецкай арміі, які апынуўся ў канцлагеры Сабібор, удалося арганізаваць паўстанне зняволеных у 1943 годзе. Аўтарам ідэі фільма стаў міністр культуры Расіі Уладзімір Мядзінскі. Цырымонія ўручэння прэміі «Оскар» адбудзецца ў лютым 2019 года. Адзіным на дадзены момант расійскім фільмам, які атрымаў статуэтку ў гэтай намінацыі, застаецца стужка Мікіты Міхалкова «Стомленыя сонцам» (1995).

ДОЛАРЫ ЗІМБАБВЭ ЗАМЕСТ ЕЎРА...

Завершана расследаванне крымінальнай справы аб фальшываманецтве, паведамілі ў Следчым камітэце.

62-гадовы мінчанін ажыццяўляў збыт падробленых грашовых купюр. Следствам было ўстаноўлена 16 эпізодаў супрацьпраўнай дзейнасці абвінавачанага. З дапамогай камп'ютарнай тэхнікі ён вырабляў з сербскіх дынараў і зімбабвійскіх долараў «еўра», а потым збываў.

Усяго ў мужчыны выяўлена і канфіскавана 330 купюр розных валют, прадстаўленых у асноўным расійскімі рублямі і еўра. Пры гэтым дзве купюры наміналам па 1000 долараў Зімбабвэ не мелі прыкмет падробкі. Падробленыя грашовыя білеты выкарыстоўваліся абвінавачаным для аплаты пры набыцці садавіны, парфумерыі і іншых тавараў.

Канфіскаваныя прававахоўнікамі купюры былі накіраваныя на даследаванне ў Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз. У прадстаўленых грашовых білетах даследавалася тэхналагічная, паліграфічная і фізіка-хімічная ахова. У выніку было ўстаноўлена супадзенне ўзораў з грашовымі знакамі Сербіі і Зімбабвэ. Таксама мадыфікацыі падвяргаліся расійскія рублі ўзору 1992 года — на іх мяняўся год выпуску.

Сяргей КУЛАКОЎ.

МЕСЯЦ — ПЛАНУЕМ, МАРС ТРЫМАЕМ У ГАЛАВЕ

Як хутка зямляне зноў паляцяць на Месяц? Якія перспектывы ёсць у марсіянскай праграмы? Ці магчыма пастаноўка ў найбліжэйшай будучыні пытання аб пілатаваным палёце на Марс і аб эксплуатацыі рэсурсаў гэтай планеты? Якая будучыня чакае Міжнародную касмічную станцыю (МКС)? Ці будзе падоўжаны тэрмін яе эксплуатацыі? Тэмы, якія ўзнімаюцца на XXXI міжнародным кангрэсе Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў, для недасведчанага чалавека могуць падацца экскурсам у навуковую фантастыку. Але і пра пакарэнне Марса, і тым больш пра планы высадкі на Месяц, навукоўцы і даследчыкі разважаюць абсалютна сур'ёзна. Нагадаем, што ўдзельнікамі кангрэса ў Мінску сталі каля 90 касманаўтаў з 17 краін, а таксама прадстаўнікі навукова-даследчых устаноў і нацыянальных касмічных агенцтваў.

Фота БелТА.

— Засваенне далёкага космасу становіцца актуальным па дзвюх прычынах: перш за ўсё, гэта немагчымасць спыніць памкненне чалавека да пазнання свету і ўсведамленне рэальнай пагрозы катаклізмаў касмічнага маштабу. Але ёсць фактары, якія перашкаджаюць засваенню далёкага космасу: гэта касмічная радыяцыя і мікрагравітацыя, — падкрэслівае **намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Сяргей КІЛІН.** — Пакуль найбольш рэальнай бачыцца прапанова выкарыстоўваць месяцовую арбітальную станцыю ў якасці прамежкавага этапу для перамяшчэння на арбіту Марса.

— Ёсць паказальныя выпадкі. Калі штосьці выходзіць са строю на Міжнароднай касмічнай станцыі, мы можам даставіць неабходнае абсталяванне з Зямлі, а калі гэта раптам здарыцца падчас палёту на Марс? Што ў нашых сілах? — разважае **астранаўт NASA, прафесар Джэфры ХОФМАН.** — Я мяркую, што нам у бліжэйшы час трэба сканцэнтравацца на міжнародным палёце на Месяц. І рабіць гэта трэба разам з нашымі кітайскімі калегамі, неабходна развіваць сумесныя праекты па даследаванні Месяца. Спачатку трэба правесці адпаведныя даследаванні на Месяцы, паглядзець, што будзе адбывацца з целам чалавека там, каб зразумець, ці гатовыя мы ляцець на Марс.

Космас, як і іншыя тэхнічна складаныя сферы, не застрахаваны ад чалавечага фактару. Аднак магчымасці для выпраўлення ў космасе памылкі вельмі абмежаваныя.

Між іншым, Джэфры Хофман здзейсніў пяць касмічных палётаў і чатыры выхады ў адкрыты космас. А **Сяргей КРЫКАЛЁЎ** правёў у касмічных камандзіроўках увогуле практычна тры гады свайго жыцця (803 дні). Яго сумарны рэкорд па знаходжанні на арбіце здолеў пабіць толькі другі расійскі касманаўт Генадзь Падалка, у якога 878 «касмічных» дзён. Таму ў Сяргея Крыкалёва пацікавіліся, ці патрабуюцца для такіх унікальных дасягненняў нейкія прыродныя здольнасці або іх можна развіць з дапамогай трэніровак? І які час увогуле можна лічыць максімальна дапушчальным для знаходжання чалавека ў космасе, асабліва з улікам планаў па асваенні Марса?

— Насамрэч мы гэтага яшчэ не ведаем, — адказаў касманаўт. — Зараз праводзяцца навуковыя эксперыменты. І ўсе, хто доўгі час знаходзіўся ў космасе, таксама становяцца аб'ектамі для навуковых і медыцынскіх даследаванняў. Больш-менш зразумелыя даныя ёсць пакуль толькі па радыяцыі (па разавай і размеркаванай дозе). Канешне, усе, хто лятае ў космас, праходзілі складаны медыцынскі адбор, бо мы яшчэ не ведалі, што нас чакае, якія нагрузкі будуць на чалавечы арганізм. З іншага боку, самі караблі і знаходжанне на МКС становяцца больш зручнымі для касманаўтаў. Плошчы станцыі дазваляюць касманаўтам перасоўвацца і кантактаваць са сваімі замежнымі калегамі. Больш мяккім стаў і працэс спуску касманаўтаў на Зямлю.

Космас, як і іншыя тэхнічна складаныя сферы, не застрахаваны ад чалавечага фактару. Аднак магчымасці для выпраўлення ў космасе памылкі вельмі абмежаваныя. Калі ў 1985 годзе «замаўчала» савецкая касмічная станцыя «Салют-7», перад касманаўтамі Віктарам Савіных і Уладзімірам Джанібекавым была пастаўлена задача — «ажывіць» станцыю, аднавіць яе працаздольнасць, а калі гэта не атрымаецца, то патапіць станцыю ў акіяне.

— Падчас эксплуатацыі нашых касмічных караблёў і МКС была маса няштатных сітуацый. Практычна ў кожнага, хто сядзіць у гэтай зале, ёсць пра што расказаць, — канстатуе **Віктар САВІНЫХ.**

— Калі паўстала пытанне, як забяспечыць падлёт карабля да некіраванай станцыі, была распрацавана новая методыка збліжэння са станцыяй, і зараз ужо ўсіх касманаўтаў рыхтуюць да такіх сітуацый, — кажа Сяргей Крыкалёў.

— Так, мы на Зямлі вельмі сур'ёзна рыхтуемся да самых розных аварыйных сітуацый: ад пажараў і разгерметызацыі да выратавання станцыі і яе аварыйнага пакідання, — пацвярджае **расійскі касманаўт Алег СКРЫПАЧКА.** — Самая важная якасць для чалавека, які марыць пра космас, — гэта мэтанакіраванасць. Канешне, патрабуюцца выдатнае здароўе і добрая адукацыя, але каб прайсці ўвесь складаны працэс адбору, трэніровачны працэс, патрабуецца вельмі шмат часу і намаганняў. А з кім бы я не хацеў аказацца ў космасе побач? Думаю, што такіх людзей у касманаўты не бяруць...

Трэба растлумачыць, што Алег Скрыпачка прыйшоў у атрад касманаўтаў у 27 гадоў, а першы свой касмічны палёт здзейсніў толькі ў 40 гадоў. У ходзе першага палёту ў яго былі тры выхады ў адкрыты космас.

Дарэчы, пытанні накшталт «А наколькі ўвогуле апраўдана знаходжанне чалавека ў космасе (у тым ліку і ў плане фантастычных фінансавых выдаткаў)?», «Што гэта — неабходнасць ці рэалізацыя чалавечых амбіцый?» — хвалююць пераважна людзей, далёкіх ад космасу.

Боні ДАНБАР, прэзідэнт Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў, якая сама здзейсніла пяць касмічных вандровак, нікольі не сумняваецца ў далейшым развіцці пілатаванай касманаўтыкі.

— У XXI стагоддзі мноства краін выкарыстоўваюць космас у мірных даследчых мэтах. Найбольш важны праект, які сёння рэалізуецца ў космасе, — гэта Міжнародная касмічная станцыя. У гэтай праграме ўдзельнічае пяць розных касмічных агенцтваў — Расіі, ЗША, Японіі, Канады і Еўропы. На арбіце пабывалі ўжо прадстаўнікі 38 дзяржаў. Мяркую, што ў найбліжэйшае дзесяцігоддзе мы станем сведкамі таго, як і іншыя краіны пачнуць рэалізоўваць касмічныя праграмы і адпраўляць сваіх касманаўтаў на арбіту. У космас будуць адпраўляцца не толькі з мэтай даследаванняў, але ў тым ліку ў турыстычных мэтах. Упэўнена, што ў гэтым стагоддзі касманаўтыка будзе развіваецца гэтак жа актыўна, як і авіяцыя ў мінулым. Я не магу прадказваць будучыню, але магу з упэўненасцю сказаць, што трывалы падмурак для развіцця касманаўтыкі забяспечваюць навука і інжынерыя. І ключавую ролю ў гэтым іграюць акадэміі навук, — дадала Боні Данбар.

12 верасня ў рамках праграмы кангрэса запланаваны Дзень супольнасці: гэта традыцыя, калі касманаўты і астранаўты сустракаюцца з грамадскасцю, каб «запаліць» моладзь касмічнымі марамі, расказаць пра сучасны стан развіцця касманаўтыкі і яе перспектывы. Удзельнікі кангрэса плануюць наведаць беларускія школы, як у сталіцы, так і ў Мінскай вобласці, а таксама БДУ, БНТУ, БДУІР, Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт і Мінскае сувораўскае ваеннае вучылішча.

Надзея НІКАЛАЕВА.

БелВЭБ

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	На 01.07.2018	На 01.01.2018
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	57 283	66 731
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	359	504
4	Средства в Национальном банке	1103	393 138	413 976
5	Средства в банках	1104	92 953	243 226
6	Ценные бумаги	1105	635 427	575 097
7	Кредиты клиентам	1106	2 481 749	2 636 457
8	Производные финансовые активы	1107	–	–
9	Инвестиции в зависимые юридические лица		–	–
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица		–	–
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108	1 420	821
12	Основные средства и нематериальные активы	1109	192 954	193 828
13	Доходные вложения в материальные активы	1110	–	–
14	Имущество, предназначенное для продажи	1111	1 750	2 696
15	Отложенные налоговые активы	1112	7	7
16	Деловая репутация		–	–
17	Прочие активы	1113	27 457	33 365
18	**ИТОГО активы**	**11**	**3 884 497**	**4 166 708**
19	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
20	Средства Национального банка	1201	20 026	5 009
21	Средства банков	1202	1 123 120	1 217 570
22	Средства клиентов	1203	2 129 773	2 351 252
23	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	15 738	4 507
24	Производные финансовые обязательства	1205	–	–
25	Отложенные налоговые обязательства	1206	183	190
26	Прочие обязательства	1207	52 602	59 980
27	**ВСЕГО обязательства**	**120**	**3 341 442**	**3 638 508**
28	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
29	Уставный фонд	1211	117 408	117 408
30	Эмиссионный доход	1212	–	–
31	Резервный фонд	1213	60 714	60 713
32	Фонд переоценки статей баланса	1214	78 853	80 388
33	Накопленная прибыль	1215	286 080	269 691
34	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации		543 055	528 200
35	Доля неконтролирующих акционеров		–	–
36	**ВСЕГО собственный капитал**	**121**	**543 055**	**528 200**
37	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**	**3 884 497**	**4 166 708**

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках за 6 месяцев 2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	За 6 месяцев 2018 года	За 6 месяцев 2017 года
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	141 169	178 840
2	Процентные расходы	2012	64 454	91 191
3	Чистые процентные доходы	201	76 715	87 649
4	Комиссионные доходы	2021	49 219	43 239
5	Комиссионные расходы	2022	17 464	13 930
6	Чистые комиссионные доходы	202	31 755	29 309
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	53	53
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	230	778
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	7 147	8 058
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(28)	(190)
11	Чистые отчисления в резервы	207	12 120	25 166
12	Прочие доходы	208	5 916	6 830
13	Операционные расходы	209	69 584	72 055
14	Прочие расходы	210	4 509	4 872
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	35 575	30 394
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	7 817	4 880
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**	**27 758**	**25 514**
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц		–	–
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц		–	–
20	**ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**		**27 758**	**25 514**
21	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации		27 758	25 514
22	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)		–	–
23	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях			
24	Базовая прибыль на простую акцию	22	–	–
25	Разводненная прибыль на простую акцию	23	–	–

Председатель Правления Н.В. Лузгин

Главный бухгалтер Л.А. Филиппова

Дата подписания: 14 августа 2018 года

Консолидированная бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 № 6. УНП 100010078.

■ Сугучча

НА МОВЕ ДРУЖБЫ

Амаль дзве сотні кніг, якія выйшлі на кітайскай, англійскай і рускай мовах і прысвечаныя культуры і эканоміцы, гісторыі і літаратуры Кітая, занялі пачэснае месца ў адмысловым аддзеле сталічнай кнігарні «Кнігі&кніжачкі». Міжнародны праект «Паліцы кітайскіх кніг», які рэалізаваны ўжо ў больш як 10 краінах свету, цяпер упершыню прадстаўлены і ў Беларусі.

Фота Канстанціна ДРОБАВА.

Як адзначыў на цырымоніі адкрыцця праекта **міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ**, цікавасць да кітайскай літаратуры ў Беларусі, як і ва ўсім свеце, няўхільна расце, а існуючая ў нашай краіне школа кітаістыкі дапамагае айчынным выдавецтвам выпускаць у свет кнігі, прысвечаныя кітайскай праблематыцы.

Так, Выдавецкі дом «Звязда» выпусціў ужо больш як 10 кніг у серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая», зборнік «Пад крыламі дракона. 100 паэтаў Кітая», а летась да 25-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Кітаем убачыла свет кніга «Беларуска-кітайскія адносіны ва ўспамінах беларускіх паслоў». Сёлета эстафету працягнула выдавецтва «Мастацкая літаратура», якое выпусціла ўжо два паэтычныя зборнікі з серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая» і зборнік «Пялёсткі лотаса і хрызантэмы. 100 паэтаў Кітая XX стагоддзя».

Ажыццяўленне праекта «Паліцы кітайскіх кніг», падкрэсліў **пасол Кітая ў Беларусі Цуй ЦЫМІН**, стала чарговым крокам у супрацоўніцтве і культурным абмене паміж нашымі краінамі. Ініцыятарам яго выступіла Кітайская дзяржаўная адміністрацыя па прэсе і выданнях пры актыўнай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Беларусі, а непасрэднымі выканаўцамі — Кітайская нацыянальная карпарацыя па імпарце і экспарце выданняў і ААТ «Белкніга».

Што да перспектыў далейшага «кніжнага абмену», то, як расказалі прадстаўнікі Кітайскай нацыянальнай карпарацыі па імпарце і экспарце выданняў, з 2000 года ў КНР выдадзена больш як 40 кніг беларускіх аўтараў, і гэта праца, безумоўна, будзе працягвацца. «Я глыбока ўражаная тым, што беларускія выдавецтвы паспяхова рэалізуюць праект «Светлыя знакі: паэты Кітая», — прызналася віцэ-старшыня карпарацыі Пан Лілі. — Нават самі кітайцы не заўжды разумеюць старажытную кітайскую паэзію, мову яе сімвалаў і метафар, а калі гаворка ідзе пра мастацкі пераклад, то задача яшчэ больш ускладняецца. Калі ў нас знойдуцца высокакваліфікаваныя перакладчыкі з беларускай мовы, то мы, канешне, з задавальненнем рэалізуем аналагічны праект у нашай краіне і выдадзім, напрыклад, зборнік «100 паэтаў Беларусі».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ЯК ТРЭБА ЖЫЦЬ?

Паэтычная версія адказу-разважання цяпер спыніць мінака ў завулку імя Пушкіна ў Гомелі

На доме, дзе жыў іншы паэт — Анатоль Грачанікаў, цяпер памятная дошка. На ёй занатаваны, бадай, самыя вядомыя радкі выдатнага беларускага творцы. Сёлета магло б споўніцца 80 гадоў чалавеку, якому было накавана пражыць толькі 52. Юбілейную дату ў Гомелі ўшанавалі адкрыццём мемарыяльнай дошкі на тым доме, дзе Анатоль Сямёнавіч жыў, калі выйшаў яго першы паэтычны зборнік «Магістраль».

Не трэба жыць як набяжыць.
Так жыць на свеце трэба,
Каб да апошніх дзён любіць
Людзей, зямлю і неба...

Гэтыя афарыстычныя радкі паэта цяпер і на памятнай дошцы. Каб яе ўсталяваць, 32 члены гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі сабралі грошы і зрабілі такі падарунак усім гамяльчанам. Каб памяталі, што побач з імі жыў і пісаў узнёслыя вершы майстар слова, якога другі беларускі класік, таксама родам з Гомельшчыны, Іван Шамякін, у свой час назваў «беларускім Ясеніным». Прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны Іван Штэйнер гаворыць, што Грачанікаў — сапраўдная падзея ў нашай нацыянальнай паэзіі:

— Паэт спрабаваў спалучыць ціхую пейзажную лірыку з нашым імклівым жыццём. І невыпадкова, што вельмі многія яго творы сталі шчымлівымі песнямі, якія і цяпер хвалююць нас:

Над ярам, над крутым
Чаромха расцвіла,
Над ярам, над крутым
Чаромхава завея.
Я дзякую табе,
Што ты са мной была,
Як белая мая лілея...»

Старшыня гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Гаўрыловіч лічыць, што ўсё, некалі напісанае Грачанікавым, — адрасавана нашчадкам:

— Гэта наказ паэта ўсім беларусам. Магчыма, творчасць Грачанікава яшчэ не да канца ацэнена. Мы рады, што наша задумка здзейснілася. Макет памятнай дошкі выдатнай асобы стварыў літаратар і мастак Генадзь Говар.

У «Славянскіх літаратурных дажынках — 2018», што прайшлі на працягу трох дзён на Гомельшчыне, узялі ўдзел пісьменнікі не толькі нашай краіны, але і Расіі, Украіны. У межах пісьменніцкага форуму названы пераможцы рэгіянальнага літаратурнага конкурсу «Праваслаўе — мая надзея». У праграму «Дажынак» быў уключаны і II Форум маладых літаратараў і аматараў мастацкай творчасці. Яго ўдзельнікі прадставілі свае работы ў чатырох тэматычных конкурсах, два з якіх былі прысвечаны жыццю і творчасці лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Анатоля Грачанікава. Апошні дзень «Дажынак» прайшоў у Калінкавіцкім і Ельскім раёнах, дзе пісьменнікі правялі пераклічку славянскіх літаратараў, майстар-класы і сустрэчы з чытачамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Запрашальнік

ФРАГМЕНТЫ ВІКТАРА АЛЬШЭЎСКАГА

У Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася персанальная выстаўка мастака

Чатыры поўнамаштабныя канцэпцыі ўвасобіліся ў чатырох частках новай персанальнай выстаўкі Віктара Альшэўскага ў Нацыянальным мастацкім музеі. «Кропка адліку» прымеркавана да 65-гадовага юбілею аўтара і становіцца яго своеасаблівай справаздачай. Адкрыццё экспазіцыі адбылося ў прысутнасці Міхаіла Мясніковіча, Лідзіі Ярмошынай, Паўла Латушкі, землякоў Віктара Альшэўскага і яго калег-мастакоў.

Выстаўка складаецца з праектаў «Мой Мінск», «Музеі свету», «Фрагменты Вавілонскай вежы» і «Партрэт сучасніка». Напрыклад, збор «Фрагменты Вавілонскай вежы», што пачаў стварацца яшчэ ў 2003 годзе, складаецца з 52 палотнаў, якія змяшчаюць у сабе гістарычныя помнікі, архітэктурныя здабыткі, сімвалы эпох і краін, і ставіць пытанне ў тым ліку месца беларускай культуры ў кантэксце сусветнай. Як і кожная з частак, што транслюе арыгінальную ідэю, але таксама ўкладаецца ў апазіцыю нацыянальны — сусветны.

Віктар Альшэўскі з'яўляецца прафесарам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ініцыятарам стварэння Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, знаным, і не толькі ў Беларусі, мастаком і чалавекам, што прасоўвае беларускую культуру за межамі краіны.

«З Віктарам Уладзіміравічам мы пазнаёміліся ў 2000 годзе, калі ў галерэі Міністэрства замежных спраў Беларусі мы адкрывалі яго персанальную выстаўку, — расказаў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Францыі, па сумяшчальніцтве ў Іспаніі, Павел ЛАТУШКА** на цырымоніі адкрыцця. — Як вы ведаеце, зараз гэта даволі знакавая для беларускіх мастакоў зала, бо ў будынку міністэрства прадстаўляе замежным дэлегацыям узровень нашага выяўленчага мастацтва. Я абсалютна згодны са словамі міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея, які сказаў, што выяўленчае мастацтва — адзін з самых яскравых і найбольш запатрабаваных прыкладаў культуры Беларусі, які, магу з гонарам гэта сказаць, атрымлівае найбольш высокую ацэнку. Сведчаннем гэтага з'яўляецца той факт, што за апошнія гады ў Францыі і Іспаніі мы прадставілі каля сотні сучасных беларускіх мастакоў, і для нас вельмі важна, што беларуская культура выходзіць за межы краіны».

Выстаўка Віктара Альшэўскага «Кропка адліку» праходзіць пры падтрымцы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Міністэрства культуры, Міністэрства замежных спраў, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, пасольства Беларусі ў Францыі і Нацыянальнага мастацкага музея.

Пазнаёміцца з экспазіцыяй можна да 30 верасня.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ

■ З нагоды

У БІБЛІЯТЭКІ — АДЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ

Пра «трэцюю прастору», доступ да інфармацыі і кнігі на роднай мове

15 верасня будзе адзначацца Дзень бібліятэк. Чым не нагода зазірнуць у гэты дзень у бліжэйшыя бібліятэкі, прыемным словам прывітаць іх супрацоўнікаў — і, вядома, узяць добрую кнігу. А напярэдадні свята ў Нацыянальным прэс-цэнтры адбылася прэс-канферэнцыя. Размова атрымалася даволі сур'ёзная: гаварылі пра скарачэнне колькасці сельскіх бібліятэк, пра новыя формы працы, якіх вымагае час інфармацыйных тэхналогій, і пра павелічэнне цікавасці да беларускамоўнай літаратуры.

— У краіне налічваецца 2024 бібліятэкі, якія размяшчаюцца ў сельскай мясцовасці. Гэта каля 78 % ад агульнай колькасці, — адзначыў **галоўны спецыяліст упраўлення культуры і народнай творчасці галоўнага ўпраўлення культуры і аналітычнай работы Міністэрства культуры Беларусі Сяргей БАЦЯН.** — Пры гэтым у Беларусі налічваецца больш за 20 тысяч сельскіх населеных пунктаў, дзе пражывае больш за два мільёны насельніцтва — каля 22 % ад агульнай колькасці. Яшчэ з мінулага дзесяцігоддзя прасочваецца тэндэнцыя, якая сведчыць пра скарачэнне колькасці бібліятэк, у першую чаргу ў сельскай мясцовасці. За 2017 год колькасць публічных бібліятэк скарацілася на 3,4 %. Дарэчы, гэта менш, чым у мінулыя два гады, таму можна казаць пра пэўную стабілізацыю.

Спецыялісты кажуць, што скарачэнне колькасці бібліятэк у вёсках — вымушаная мера. Аднак жыхары такіх населеных пунктаў не застаюцца без кніг — раз на некалькі тыдняў да іх прыязджае бібліёбус, які прывозіць за раз каля сотні кніг.

Дырэктар Навуковай бібліятэкі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, старшыня Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі Іна ЮРЫК звярнула ўвагу на новыя формы працы:

— За мяжой сёння добра апраўдвае сябе такая форма працы, як гібрыдная бібліятэка. Яна дае доступ не толькі да кніжнага фонду, але і да электронных рэсурсаў, іншых паслуг. Да таго ж бібліятэка разглядаецца як прастора, так званае трэцяе месца. Трэба сказаць, што лічбавая няроўнасць з кожным годам павялічваецца. Сучасныя тэхналогіі — паўсюль. Валоданне інфармацыйнай адукацыяй, лічбавымі навыкамі — адна з самых важных кампетэнцый. Аднак далёка не ўсе сёння маюць доступ да інтэрнэту, валодаюць камп'ютарамі, гаджэтамі. Таму роля публічных бібліятэк у наш час — адаптацыя і магчымасць рэалізацыі права на доступ да інфармацыі. І нашы ўстановы робяць гэта бясплатна. Бібліятэчная сетка актыўна працуе з мясцовай супольнасцю, мы падтрымліваем розныя віды нефармальнай адукацыі. Да нас могуць прыходзіць працаваць фрылансеры (катэгорыя, якая даволі хутка расце). Бібліятэка адчынена, яна дае магчымасць спакойна папрацаваць, у тым ліку і са сваімі электроннымі прыладамі, у той жа час — скарыстацца кніжным фондам і электроннымі рэсурсамі. Чалавек можа арганізаваць сабе рабочае месца проста ў бібліятэцы, і гэта не кажучы пра задавальненне яго адукацыйных патрэб, культурных у тым ліку.

«Калі мы кажам пра друкаваныя дакументы — гэта не толькі газеты, часопісы, кнігі, — звяртае ўвагу **першы намеснік дырэктара па абслугоўванні карыстальнікаў і ідэалогіі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алена ДАЎГАПОЛАВА**. — Што датычыцца Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, гэта і паштоўкі, плакаты, карты, вінілавыя дыскі. А таксама ўсе электронныя рэсурсы. Усе буйныя бібліятэкі, у прыватнасці нацыянальныя, маюць добра структураваныя сайты».

Пра рост патрыятызму і любові да айчыннай культуры расказала **дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк Мінска Таццяна ШВЕД**:

— У бібліятэках праходзіць даволі шмат прэзентацый кніг на беларускай мове. Мы імкнёмся выхаваць у нашых юных наведвальнікаў любоў да свайго роднага краю, мовы, літаратуры. У адной з бібліятэк працуе «Беларуская хатка», дзе мы можам дапамагчы дашкольнікам вывучыць беларускую мову. Хачу заўважыць, што нягледзячы на меркаванне, што на беларускай мове мала размаўляюць, ёсць пэўныя іншыя праблемы. Аднак я звярнуся да лічбаў: кнігавыдача асобнікаў на беларускай мове ў 2017 годзе, у параўнанні з 2016-м, вырасла на 26 тысяч. Бацькі малодшых школьнікаў пачалі больш запытвацца пра літаратуру на беларускай мове.

Па словах Таццяны Швед, усцешна і тое, што пачало выдавацца больш літаратуры на роднай мове для дашкольнікаў, малодшых школьнікаў, таму цяпер бібліятэкарам ёсць што прапанаваць сваім юным чытачам.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

АМУНІЦЫЯ — НА СУСВЕТНЫМ УЗРОЎНІ

Праца ратавальніка залежыць не толькі ад яго кваліфікацыі, але і ад амуніцыі і тэхнікі, з дапамогай якіх ён працуе. Больш за тое, яны павінны пастаянна ўдасканальвацца, паколькі складанасць пастаўленых перад ратавальнікамі задач год ад году расце. Навукова-даследчаму інстытуту пажарнай бяспекі і праблем надзвычайных сітуацый МНС Беларусі ёсць над чым няспынна працаваць у гэтым кірунку.

Аб тым, якія ж новыя распрацоўкі ўкараняюцца ў прафесійную дзейнасць утаймавальнікаў стыхій, расказвае **начальнік цэнтра навукова-даследчыцкай работы Сяргей АСТАШОЎ.**

— Мы гатовы прэзентаваць наш новы шлем. Ён ні ў чым не саступае сусветным аналагам, але пры ўсім гэтым мае кошт, ніжэйшы ўтрая за іх. Усе камплектуючыя для яго зроблены ў Беларусі. Крытэрыямі пры распрацоўцы, акрамя максімальных ахоўных уласцівасцяў, сталі зручнасць пры нашэнні, камплектаванне перамоўнымі прыладамі, каб аператыўна перадаваць інфармацыю і не пераключаць увагу на рацыю, і ліхтаром. Замест эмблемы можна ўсталяваць экшн-камеру для здымак. Да таго ж ён больш лёгкі, што ў рабоце пры поўнай баявой выкладцы таксама немалаважна. Мы стваралі гэты шлем амаль два гады.

— Ці ёсць навацыі ў баявым адзенні для пажарных?

— Актыўныя работы распачаліся яшчэ гадоў 15 назад. Яшчэ нашы віцебскія калегі пачалі распрацоўкі на базе арселону. Гэтая тэрмастойкая тканіна была прыдумана ў СССР яшчэ на пачатку 1970-х гадоў. З сярэдзіны 70-х яе пачалі выпускаць у Светлагорску. Класічныя аранжавыя курткі якраз з яе і зроблены. Дастаткова сказаць, што арселон не плавіцца і вытрымлівае тэмпературу ажно да 250 градусаў. З кожным годам адзенне з арселону дапрацоўвалі, але ў рэшце рэшт мы дасягнулі яго максімальна магчымых фізічных паказчыкаў. Таму гадоў пяць назад мы арселон выкарыстоўваць перасталі. У кожнага адзення ёсць свае недахопы, якія выяўляюцца толькі падчас «баявой» эксплуатацыі. Таму з цягам часу з'яўляюцца новыя патрабаванні, і ўжо ў Светлагорску распрацоўваюць новае валакно. Мы хочам, каб беларуская тканіна для пажарных не толькі адпавядала замежным аналагам, але і пераўзыходзіла іх. Зараз жа яна і знаходзіцца на сярэднім сусветным узроўні, прычым маючы кошт удвая меншы. Валокны для адзення выкарыстоўваюцца тыя, з якіх робяць бронекамізэлькі. Яно мацнейшае ў тры разы за тое, што мы носім паўсядзённа.

Што да абутку, то наш інстытут сумесна з адным з віцебскіх прадпрыемстваў распрацаваў боты пажарнага. Раней у нас быў звычайны гумавы абутак. Замежныя ж ратавальнікі носяць скураныя боты. Іх фізічныя ўласцівасці такія ж, як і ў гумавых, але яны вельмі зручныя. Нашы боты не прамакаюць на працягу 60 хвілін, абараняюць ад праколу, удару, маюць негаручую падэшву і скуру. І пры ўсім тым ніхто з замежных канкурэнтаў не можа прапанаваць нешта падобнае за такую ж ці меншую цану. Ды і за мяжой патрабаванне ў выглядзе 60 хвілін непрамакальнасці вытрымліваюць нямногія ўзоры. Справа ў тым, што выпуск такога абутку абумоўлены сваімі кліматычнымі асаблівасцямі. Узімку тушэнне пажару адбываецца пры вельмі нізкіх тэмпературах. Ногі ў пажарнага прамоклі, а яму яшчэ дзяжурыць далей на «сутках». І як бы чалавек пасля гэтага не захварэў.

Фактычна мы выступаем пасярэднікамі паміж людзьмі, якія тушаць пажары, і тымі, якія робяць адзенне. У працэсе працы ратавальнікаў мы збіраем пажаданні і заўвагі і пераадрасоўваем іх на заводы-вытворцы. Пасля карэкціровак мы зноў тэсціруем адзенне ў нашых лабараторыях, каб яно адпавядала ўсім стандартам бяспекі. І так год за годам мы пастаянна крочым наперад.

Раней у нас выкарыстоўваўся касцюм Л-1. Ён абараняе ад хімічных рэчываў, у ім можна працаваць у вадзе. Але гэты касцюм яшчэ савецкай распрацоўкі, ён вядомы яшчэ з пачатку 80-х. Была пастаўлена задача распрацаваць айчынную амуніцыю такога тыпу. Так і з'явіўся касцюм індывідуальнай аховы КІЗ. У ім можна працаваць у халоднай вадзе да чатырох гадзін, а ў гарачай — да пяці хвілін. Бывае так, што рве трубаправод з гарачай вадой, і вось трэба падысці і закрыць вентыль. Касцюм сертыфікаваны ў нас і ў Расіі. Ён бяспечны пры працы з кіслотамі, шчолакам, нафтай, алівай, вадой і нават некаторымі радыеактыўнымі рэчывамі. Па кошце ён таннейшы за Л-1, прычым больш эрганамічны і выконвае значна больш функцый.

— Ці ідзе наша пажарная прадукцыя на экспарт?

— У абмежаванай колькасці. Трэба ў кожнай краіне праходзіць працэдуру сертыфікацыі. Яна вельмі дарагая, і трэба прадаваць вельмі вялікія аб'ёмы, каб усё акупілася. Разавыя пастаўкі ідуць у Расію, Казахстан.

— Апошнімі гадамі пажарны аўтапарк у краіне моцна змяніўся. Ужо нікога не здзівіш цыстэрнамі ў 10 і нават 12 тон. А ці ёсць планы развіваць гэты сектар далей?

— Тэарэтычна працаваць далей можна. Наш МАЗ, на шасі якога і будуюцца пажарныя аўтамабілі, зрабіць такую тэхніку ў стане. Але ці ёсць у гэтым практычная неабходнасць? Напрыклад, у буйных гарадах вельмі моцна стаіць праблема запаркаванасці двароў у шматпавярховай забудове. Прадрацца скрозь шэрагі аўтамабіляў, асабліва ўглыб квартала, не так проста нават на сучаснай дзесяцітоннай машыне. Аўтамабіль з яшчэ большым аб'ёмам вогнетушыльнага рэчыва стане яшчэ больш габарытным, і манеўранасць толькі знізіцца. І як тады падабрацца да пажару? Тым больш што зараз аб'ём у 10—12 тон з'яўляецца аптымальным для тушэння пажару нават ва ўмовах аддаленых крыніц вады ў сельскай мясцовасці. А для гарадскіх умоў зараз распрацоўваецца спецыяльная малагабарытная цыстэрна.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ПЕРАКУЛІЎ НА ПЛІТУ КАНІСТРУ

У Лепелі сямікласнік атрымаў апёкі, калі спрабаваў распаліць газавую пліту: ён перакуліў пяцілітровую каністру з бензінам, якая стаяла побач.

Здарэнне адбылося ўвечары. Пра загаранне ў жыллі па вуліцы 1-й Залінейнай ратавальнікам паведамілі відавочцы. Мясцовы жыхар убачыў дым, а пасля — хлопчыка, які выбягаў з суседняга дома. Жонка сведкі выклікала пажарных, а муж тым часам да прыбыцця ратавальнікаў забег у суседні дом і падручнымі сродкамі патушыў загаранне на кухні. Высветлілася, што падлетак самастойна, калі дарослых не было ў доме, спрабаваў распаліць газавую пліту і выпадкова перакуліў пяцілітровую каністру з бензінам, якая знаходзілася побач. Па інфармацыі Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС, з апёкамі другой — трэцяй ступені ног і перадплечча правай рукі хлопца шпіталізавалі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АРСЕНАЛ ЗБРОІ

Як паведаміла ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, супрацоўнікі ГУ па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй затрымалі падазраванага ў незаконным абароце зброі.

7 верасня вечарам у аграгарадку Краснае Гомельскага раёна супрацоўнікі ДАІ спынілі аўтамабіль, якім кіраваў жыхар г. п. Гарадзея Мінскай вобласці. Пры аглядзе транспартнага сродку праваахоўнікі выявілі цюнінгаваны аўтамат Калашнікава з прыстасаваннем для бясшумнай стральбы, пісталеты Макарава і ТТ, па некалькі падрыхтаваных магазінаў да пералічанай зброі, 4 ручныя гранаты, 3 выбуховыя пакеты і сотні патронаў рознага калібру.

Па дадзеным факце Гомельскім раённым аддзелам Следчага камітэта 8 верасня была ўзбуджана крымінальная справа па ч. 2 арт. 295 КК Беларусі (незаконныя дзеянні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў).

Затрыманага пасадзілі ў ізалятар часовага ўтрымання, а ў яго кватэры, гаражы і службовым кабінеце правялі вобыскі. Праваахоўнікі канфіскавалі там зарэгістраваную зброю: 2 наразныя карабіны, 4 гладкаствольныя стрэльбы і 2 пісталеты, а таксама незаконна захаваныя кулямёт, 5 аўтаматаў, 10 вінтовак, 10 пісталетаў, 28 гранат, 265 выбуховых прыстасаванняў, каля 2 кілаграмаў выбуховых рэчываў і каля 10 тысяч патронаў рознага калібру.

У ходзе далейшых аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў па дадзенай справе быў затрыманы грамадзянін з блізкага асяроддзя фігуранта. Пры аглядзе яго жылля ў Брэсцкай вобласці знайшлі зарэгістраваныя наразны даўгаствольны карабін, гладкаствольную стрэльбу і незаконна захаваныя 3 вінтоўкі, 3 гладкаствольныя паляўнічыя стрэльбы і 381 патрон рознага калібру.

У цяперашні час выяўляюцца крыніцы паходжання такога шырокага арсеналу і магчымыя саўдзельнікі фігуранта ў незаконным абароце зброі.

Сяргей КУЛАКОЎ.

ЗНОЎ БЛУКАЮЦЬ У ЛЯСАХ

За мінулыя суткі ратавальнікі тройчы выязджалі на пошукі людзей, якія заблудзілі ў лясах. Два паведамленні паступіла з Віцебскай вобласці, адно — з Магілёўскай, паведамілі ў МНС.

У 16.18 быў атрыманы сігнал аб неабходнасці пошукаў дзвюх жанчын, якія заблудзілі ў лесе каля вёскі Казлы Горацкага раёна. Высветлілася, што за тры гадзіны да гэтага яны пайшлі ва ўгоддзі і згубіліся. На пошукі выехалі работнікі МНС і РАУС. У 17.26 жанчыны выйшлі на гук аўтацыстэрны, у медыцынскай дапамозе яны патрэбы не мелі.

У 17.59 у Расонскім раёне каля вёскі Янкавічы згубілася пенсіянерка 1955 года нараджэння. У пошуках былі задзейнічаны ратавальнікі, супрацоўнікі міліцыі і мясцовыя жыхары. У 19.39 жанчыну знайшлі работнікі МНС, яна не пацярпела.

У 19.31 паступіла паведамленне аб тым, што ў лясным масіве каля вёскі Гараватка Віцебскага раёна заблудзілі жанчына і мужчына. Ратавальнікі, якія выехалі на пошукі, знайшлі іх за паўгадзіны. У 19.52 яны выйшлі на гук аўтацыстэрны, ніхто з іх не пацярпеў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СХОВАНКА ЗА СЦЕНКАЙ ПРЫБІРАЛЬНІ

Агляд домаўладання жыхара вёскі Убарцкая Рудня правялі работнікі Тураўскай міжрайінспекцыі і супрацоўнік Лельчыцкага РАУС. Праваахоўнікі падазравалі, што мужчына можа незаконна захоўваць у доме стрэльбу. Як аказалася, гаспадар уладкаваў сапраўдны тайнік, у якім хаваў 6 незарэгістраваных стрэльбаў, 50 патронаў і 1,5 кілаграма пораху. Схованка знаходзілася за двайной сценкай прыбіральні на дварэ.

У доме на гарышчы інспектары выявілі яшчэ і забароненыя прылады лоўлі рыбы — 16 сетак агульнай даўжынёй 920 метраў. Таксама на падворку знайшлі 200 літраў брагі і самагонны апарат.

Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, некалькі гадоў таму міліцыя ўжо канфіскоўвала ў мужчыны чатыры незарэгістраваныя стрэльбы, за што іх уладальнік быў аштрафаваны. Улічваючы «цікавасць» парушальніка да нелегальнай зброі і той факт, што яго дом знаходзіцца на краі лесу, можна меркаваць, што вясковец мог займацца браканьерствам.

Зараз яму пагражае пакаранне ў выглядзе штрафаў па некалькіх адміністрацыйных артыкулах — за захоўванне незарэгістраванай зброі, сетак і выраб самагонкі. Па факце незаконнага захоўвання выбуховых рэчываў (пораху) вырашаецца пытанне аб завядзенні крымінальнай справы, а гэта ўжо значна больш сур'ёзная адказнасць — папраўчыя работы, арышт, абмежаванне або пазбаўленне волі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВІЗУАЛЬНЫ МЕРЧАНДАЙЗІНГ І СУХОЕ БУДАЎНІЦТВА

Што хаваецца за назвамі новых прафесій?

Падрыхтоўка па пяці новых спецыяльнасцях распачалася ў бягучым навучальным годзе ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Так, на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў Маладзечанскім дзяржаўным політэхнічным каледжы сталі рыхтаваць спецыялістаў па захоўванні і перапрацоўцы збожжа. Як расказала **начальнік цэнтра навукова-метадычнага забеспячэння прафесійнай адукацыі Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА,** увядзенне гэтай спецыяльнасці было ініцыяванае арганізацыямі камітэта хлебапрадуктаў Мінсельгасхарча. Выпускнікі дадзенай спецыяльнасці будуць эксплуатаваць высокатэхналагічнае абсталяванне, якім аснашчаюцца сучасныя прадпрыемствы.

— У 2014 годзе Беларусь стала 68-м членам міжнароднай арганізацыі WorldSkills International. Асноўнай яе задачай з'яўляецца правядзенне міжнародных конкурсаў прафесійнага майстэрства. Прымаючы ўдзел у чэмпіянатах, наша каманда не толькі набывае новыя веды пра змест прафесійных стандартаў, але і вывучае кампетэнцыі, якія пакуль адсутнічаюць у нашых установах адукацыі, — падкрэслівае Аляксандра Пятрова. — Так, пасля аналізу зместу кампетэнцыі «Візуальны мерчандайзінг», якую прадстаўляюць на чэмпіянаце ўдзельнікі з розных краін, мы разам з уладальнікамі гандлёвых аб'ектаў распрацавалі адукацыйную праграму для падрыхтоўкі спецыялістаў, здольных распрацаваць візуальную канцэпцыю магазіна, салона ці іншага аб'екта, якая б заваблівала пакупніколў і рабіла працэс куплі максімальна камфортным. Прычым яны павінны ахопліваць увесь працэс: ад стварэння эскіза да рэалізацыі канцэпцыі. Пры распрацоўцы новай спецыяльнасці ўлічваўся вопыт падрыхтоўкі па аналагічных спецыяльнасцях у замежных каледжах. У верасні спецыялістаў па візуальным мерчандайзінгу пачалі рыхтаваць у Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя М. Кедышкі. Калі мы адчуем попыт з боку заказчыкаў кадраў, то будзем пашыраць «геаграфію» новай спецыяльнасці, укараняючы яе і ў іншых установах прафесійнай адукацыі.

Кампетэнцыя «Аўтамабільныя тэхналогіі» на рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus 2018.

Прыкладам паспяховага супрацоўніцтва сістэмы адукацыі, вытворчага сектара і бізнесу стала з'яўленне ў навучальных установах прафесіі «мантажнік каркасна-абшывачных канструкцый сухога будаўніцтва». Пры распрацоўцы праграмы ўлічваліся патрабаванні ў кампетэнцыі «Сухое будаўніцтва» WorldSkills International. Вялікую дапамогу ў яе распрацоўцы і падрыхтоўцы майстроў вытворчага навучання і выкладчыкаў аказалі спецыялісты кампаній Knauf і «Белгіпс». Адпаведных спецыялістаў цяпер рыхтуюць на базе Мінскага дзяржаўнага ПТК будаўніцтва, Мінскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя № 7 і Мінскага прафесійнага ліцэя № 12.

Удала прайшоў сёлета прыём па такіх новых спецыяльнасцях, як «сацыяльная работа» ў Мінскім дзяржаўным каледжы сферы абслугоўвання і «ахова навакольнага асяроддзя і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» у Навагрудскім дзяржаўным аграрным каледжы. Увогуле на новыя спецыяльнасці абітурыенты, як правіла, паступаюць вельмі ахвотна, дзякуючы вялікай піяр-кампаніі, якую праводзяць навучальныя ўстановы і СМІ.

Сёння разглядаецца магчымасць па ўключэнні ў пералік прафесійнай адукацыі **спецыяльнасцяў, звязаных з эксплуатацыяй прамысловых робатаў, адытыўнымі тэхналогіямі, вытворчасцю і абслугоўваннем электрамабіляў, выкарыстаннем сучасных дарожных пакрыццяў** і іншых. «Мы імкнёмся да таго, каб у нейкай меры апярэджваць эканамічны сектар, каб не было збояў пры камплектаванні калектываў спецыялістамі, якія б хутка адаптаваліся да сучаснай вытворчасці», — падкрэслівае Аляксандра Пятрова.

Напрыклад, спецыяльнасць «мехатроніка» была ўведзена на апярэджанне. Па сваёй сутнасці гэта дастаткова складаная прафесія, якая аб'ядноўвае веданне механікі, электронікі, гідраўлікі і пнеўматыкі ў абслугоўванні высокатэхналагічнага абсталявання. Такія спецыялісты сёння востра запатрабаваныя ў машынабудаванні, радыётэхніцы, харчовай прамысловасці. З улікам паўсюднага ўкаранення ў вытворчасць мехатронных сістэм гэта прафесія патрабуе далейшага развіцця і ўдасканалення.

У Мінскім дзяржаўным аўтамеханічным каледжы імя акадэміка М. Высоцкага ў кастрычніку адкрыецца вучэбная лабараторыя па вывучэнні будовы электрамабіляў. Яшчэ ў 2014 годзе ў каледжы быў створаны рэсурсны цэнтр па напрамку «тэхнічная эксплуатацыя і аўтасэрвіс», які ўключае пяць навучальных аб'ектаў: кабінет для тэарэтычнага навучання і практычныя лабараторыі.

— Сам электрамабіль у падоўжным разрэзе ў нас ужо ёсць, а тэхнікі для яго вывучэння не хапала, — канстатуе **дырэктар каледжа Валерый КІРЫЛЕНКА.** — Аднак ужо ў кастрычніку ў каледж прыбудзе адпаведнае абсталяванне, якім аснасцяць навучальную лабараторыю.

Таксама ў планах кіраўніцтва каледжа палепшыць матэрыяльна-тэхнічную базу для вывучэння будовы, эксплуатацыі і рамонту грузавых аўтамабіляў.

— З гэтай мэтай мы пачалі супрацоўнічаць з рэзідэнтамі індустрыяльнага парка «Вялікі камень», — кажа Валерый Кірыленка. — У прыватнасці, з кампаніяй Weichai, якая ў лістападзе мае намер адкрыць у парку завод па вытворчасці дызельных рухавікоў. У сакавіку паміж Рэспубліканскім інстытутам прафесійнай адукацыі і Weichai было падпісана пагадненне аб стварэнні вучэбнага цэнтра на базе нашага каледжа. Цэнтр будзе ўкамплектаваны сучасным абсталяваннем, вучэбнымі наглядным дапаможнікамі і ўзорамі рухавікоў, якія адпавядаюць экастандартам Еўра-5 і Еўра-6. Плануем, што ён адкрыецца таксама ў лістападзе.

Цяпер у каледжы атрымліваюць прафесію на дзённай і завочнай форме каля 1700 навучэнцаў. Што цікава: большасць з іх не разглядае атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі толькі як прамежкавую ступень да атрымання вышэйшай. Так, працягваюць навучанне ў вышэйшай школе 40 % выпускнікоў каледжа. Валерый Кірыленка падкрэслівае: «Гэта не азначае, што сярэдняй спецыяльнай адукацыі недастаткова для таго, каб паспяхова працаваць і будаваць кар'еру. Вышэйшая адукацыя застаецца справай асабістага выбару, а не неабходнасцю. Я ведаю, што сапраўдныя майстры могуць сваімі рукамі зарабіць нават больш, чым уладальнікі дыпломаў аб вышэйшай адукацыі. Не толькі могуць, але і зарабляюць».

■ Кібербяспека

Касмічная вандроўка па... інтэрнэце

Інтэрактыўная выстаўка «Сусвет інтэрнэту» адкрылася ў Мінску

90 працэнтаў юных беларусаў карыстаюцца інтэрнэтам, а 70 працэнтаў з іх заходзяць у сецівa штодня. Кіберпрастора стала неад'емнай часткай нашага жыцця. Але ці заўсёды знаходжанне дзяцей у сусветным павуцінні з'яўляецца бяспечным як для іх саміх, так і для блізкіх ім людзей? Хто хаваецца па той бок экрана? Якімі інтарэсамі і мэтамі кіруецца? Інтэрактыўная выстаўка для школьнікаў «Сусвет інтэрнэту» прымушае падрастаючае пакаленне пра гэта задумацца...

Выстаўка адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Гэта сумесны праект Міністэрства адукацыі, кампаніі МТС і дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ.

«Сусвет інтэрнэту» ўяўляе сабой шэсць інтэрактыўных зон. Яны прысвечаны гісторыі інтэрнэту, правілам паводзін у сецівe, бяспечнаму кантэнту і абароне асабістай інфармацыі. У гульнявой форме дзеці вандруюць ад планеты да планеты і вучацца карыстацца антывіруснымі праграмамі, генераваць надзейныя паролі; даведваюцца, як правільна кантактаваць у інтэрнэце, у тым ліку з незнаёмымі людзьмі, якую інфармацыю аб сабе можна пакідаць, а якую нельга размяшчаць у сацыяльных сетках.

ПЛАНЕТА КАНЕКТЫКУС. Атмасфера — суперадкрытая і таварыская. Насельнікі — усе жыхары Галактыкі. Прызначэнне — устанавіць кантакт і абмяняцца інфармацыяй.

ПЛАНЕТА ІКСОІД. Ніколі не ведаеш, што можа здарыцца. Насельнікі — монстры, якія прыкідваюцца сябрамі, і сябры, якія ператвараюцца ў монстраў. Мэта — адрозніць монстраў ад сяброў.

ПЛАНЕТА ШЫФРАВАТАР. Строга засакрэчаны аб'ект. Хто насельнікі — даведаешся, толькі калі трапіш на яе. Мэта — падабраць і запомніць код доступу.

У канцы касмічнай вандроўкі дзяцей чакае кібертэст.

— Сёння віртуальная прастора становіцца ўсё больш «рэальнай». Асабліва ярка гэта праяўляецца сярод дзяцей і падлеткаў, якія вольны час усё часцей праводзяць у інтэрнэце і аддаюць перавагу не жывым стасункам, а абмену паведамленнямі ў сацыяльных сетках, — канстатуе **дырэктар галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Мінадукацыі Павел ЛІС.** — Ва ўмовах усёпранікальнага працэсу лічбавай трансфармацыі немагчыма і бессэнсоўна пастаянна кантраляваць паводзіны дзяцей у сецівe, але ў нашых сілах зрабіць іх знаходжанне ў інтэрнэце больш бяспечным з дапамогай ненавязлівых адукацыйных праектаў. Інтэрактыўная выстаўка «Сусвет інтэрнэту» дазваляе данесці да хлопцаў і дзяўчат базавыя прынцыпы бяспечных паводзін у інтэрнэце ў цікавай і даступнай гульнявой форме.

— МТС — кампанія, дружалюбная дзецям. Выстаўка «Сусвет інтэрнэту» — гэта працяг праекта «Дзеці ў інтэрнэце», які мы рэалізуем ужо больш за пяць гадоў. Для нас тэма бяспечнага інтэрнэту для дзяцей — стратэгічна важная, — падкрэслівае **генеральны дырэктар МТС Уладзімір КАРПОВІЧ.** — Мы хочам, каб сучасны свет інавацый і тэхналогій быў даступным, але, самае галоўнае, бяспечным для школьнікаў і моладзі. Дзякуючы супрацоўніцтву з Міністэрствам адукацыі і ЮНІСЕФ будзем імкнуцца дапамагаць дзецям выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі правільна і з карысцю, умацоўваць веды маладога пакалення ў галіне кібербяспекі, працаваць з тэмай кібербулінга, вучыць сеткаваму этыкету. Упэўнены, што, аб'яднаўшы нашы намаганні, мы зможам зрабіць сучасны свет больш бяспечным для нашых дзяцей.

«Як паказала апошняе даследаванне ЮНІСЕФ, у Беларусі часцей за ўсё з булінгам у інтэрнэце сутыкаюцца падлеткі 13—17 гадоў. Інтэрактыўная выстаўка, якую мы запускаем, дапаможа ім разабрацца ў тым, як правільна паводзіць сябе ў той ці іншай складанай сітуацыі, і будзе садзейнічаць зніжэнню ўзроўню кібергвалту», — падкрэсліў **прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ у Беларусі доктар Рашэд Мустафа САРВАР.**

Арганізатары збіраюцца ў рамках выстаўкі правесці апытанне дзяцей на тэму кібербулінгу. Атрыманыя даныя дапамогуць ацаніць сітуацыю, а ў будучыні стануць падмуркам для розных мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне бяспекі дзяцей у кіберпрасторы.

Наведаць выстаўку «Сусвет інтэрнэту» ў Нацыянальнай бібліятэцы змогуць бясплатна ўсе ахвотныя: дзеці, бацькі і педагогі. Для гэтага трэба зарэгістравацца на сайце праекта http://detivinternete.by/ Рэгістрацыя пачалася 10 верасня. Арыенціровачны час правядзення інтэрактыўнай экскурсіі складае адну гадзіну. Дакладна вядома, што выстаўка будзе працаваць у Нацыянальнай бібліятэцы да канца кастрычніка, але час яе работы можа падоўжыцца. Усё будзе залежаць ад таго, наколькі праектам зацікавяцца дзеці, бацькі, педагогі і грамадскасць. Затым яна адправіцца ў абласныя цэнтры Беларусі. Мяркуецца, што за 2019 год выстаўка «Сусвет інтэрнэту» наведае ўсе абласныя цэнтры краіны

■

Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

«Ахвяруйце, людзі добрыя, на лячэнне дзіцяці...»

Як адносіцца да тых, хто просіць дапамогі, стоячы каля ўвахода ў магазін?

У сталіцы нярэдка можна сустрэць у падземных пераходах або каля супермаркетаў людзей, якія стаяць з шыльдамі «Дапамажыце, памірае сын», «Ахвяруйце на лячэнне дзіцяці» або «Збіраю грошы на аперацыю маме». Калі шчыра, кожны раз, калі праходзіш міма, — сэрца крывёй абліваецца. І з гэтым нічога не можаш зрабіць, хоць нейкай часткай цвярозага розуму разумееш, што часцяком неяк занадта ўжо ціснуць на шкадаванне напісаныя фразы. Многія мінакі нагінаюцца, кладуць грошы... І ідуць па сваіх справах далей з адчуваннем выкананага абавязку.

«Я прачытала ў інтэрнэце, што майму хлопчыку патрэбна помпа...»

Наогул, псіхолагі кажуць, што, сустрэўшы чалавека з працягнутай рукой, жабрака ці бамжа, мы падсвядома праецыруем яго жыццёвую сітуацыю на сябе. Любы нармальны чалавек баіцца апынуцца на дне грамадства — і мы падаём міласціну, на ўзроўні падсвядомасці як бы адкупляючыся ад падобнага лёсу. Хоць, вядома, тут прысутнічае яшчэ і шкадоба да гэтых людзей, і імкненне хоць неяк дапамагчы ім. Але, пагадзіцеся, калі мы падаём грошы, нам важна ведаць, што яны будуць выкарыстаныя па прызначэнні.

Аднойчы наша чытачка Алена Кулікова з Мінска вырашыла не проста пакласці грашовую купюру ў працягнутую руку, а сапраўды дапамагчы.

— Я сутыкнулася з такім выпадкам: на адзін праектны інстытут прыйшоў слёзны ліст з Гомеля, дзе жанчына прасіла аказаць ёй дапамогу ў набыцці для дзіцяці інсулінавай помпы, — расказвае Алена. — Яна прасіла шэсць тысяч еўра і каб потым ёй давалі штомесяц 200 еўра на набыццё расходнікаў. Гэты інстытут знаходзіўся на той момант у складанай фінансавай сітуацыі, у супрацоўнікаў былі зусім невялікія зарплаты. Тым не менш, калі прыйшоў гэты ліст, па інстытуце прайшоў кліч: трэба сабраць грошы! У лісце быў пазначаны тэлефон. І я патэлефанавала па ім, каб удакладніць некаторыя дэталі і прапанаваць дапамогу нашага грамадскага аб'яднання.

Падняла трубку жанчына. Яна расказала, што яе хлопчык ходзіць у гімназію, добра вучыцца, займаецца спортам, гэта значыць вядзе актыўны лад жыцця. У ходзе размовы высветлілася, што ў яго першая група інваліднасці. «Але, — дадае Алена, — тут важна пазбегнуць блытаніны: для дзяцей па-іншаму разлічваюць інваліднасць, там лічыцца ступень страты здароўя. Дык вось першая ступень страты здароўя — гэта самы просты выпадак, у адрозненне ад першай групы інваліднасці для дарослых, якая лічыцца самай цяжкай. І калі ў дзіцяці ёсць нават нейкая мінімальная паталогія, то першую ступень страты здароўя нескладана атрымаць. Але ў большасці выпадкаў пасля 18 гадоў такіх дзяцей прызнаюць здаровымі».

Але самае цікавае, па словах Алены Куліковай, было далей. Як аказалася, ніякі доктар інсулінавую помпу для гэтага дзіцяці не прапісваў, мама проста прачытала ў Інтэрнэце, што ёсць такая помпа і што гэта добры варыянт для дзіцяці з дыябетам. Потым высветлілася, што гэтая мама даслала ліст з просьбай аб дапамозе не толькі ў гэты інстытут, а яшчэ ў шэраг арганізацый. Прычым яна не маці-адзіночка, у сям'і ёсць бацька. На пытанне, чаму б у такім выпадку не паспрабаваць самім збіраць грошы на помпу, якую ніхто не прапісваў, мама адказала: што вы, мы зараз збіраем грошы на новую мэблю...

«І што ў гэтай сітуацыі павінен рабіць праектны інстытут, супрацоўнікі якога на той момант атрымлівалі мізэрныя заробкі, бо не было заказаў? — задаецца пытаннем Алена. — Чаму людзі павінны адрываць ад сваёй сям'і грошы, каб дапамагчы гэтай маме сабраць на нейкую міфічную помпу?»

На бутэльку гарэлкі?

Пасля гэтага Алена Кулікова пачала звяртаць увагу на людзей, якія з жаласлівымі плакатамі стаяць каля магазінаў.

— Адна жанчына збірала грошы для свайго дзядзькі, — расказвае наша суразмоўніца. — Я падышла, прачытала яе плакацік. Там было пазначана прозвішча дзядзькі — назавём яго, дапусцім, Іванам Іванавічам — і напісана, што патрабуецца тэрміновая аперацыя ў Літве коштам каля 40 тысяч еўра. Я пытаюся: а што такое з вашым дзядзькам? Аказалася, яму трэба замяніць сардэчны клапан. А чаму ў Літве? Адказ: не ведаю, ён сказаў, што трэба там. У ходзе роспытаў высветлілася, што ў дзядзькі нават інваліднасці няма, ён жыве недзе на Палессі, адзін. Як такі хворы дзядзька можа жыць адзін?

Пасля апошняга пытання жанчына хуценька сабрала свае рэчы і кінулася прэч, расказвае Алена. І я зразумела, што няма ніякага дзядзькі і ніякай хваробы. А людзі «вядуцца», нават пакуль мы з ёй размаўлялі, падышоў нейкі мужчына з хлопчыкам гадоў пяці, даў хлопчыку купюру і той паклаў грошы. А мне ўжо было зразумела, што яны пойдуць Івану Іванавічу на бутэльку гарэлкі, а з гэтага таты з хлопчыкам і з іншых чуллівых людзей «няшчасныя» толькі пасмяюцца...

Яшчэ пра адзін выпадак расказала мая знаёмая: неяк яна стаяла на станцыі метро і побач з ёй стаяў мужчына, прыстойнага выгляду, з нейкай папкай у руцэ, і, мяркуючы па ўсім, пра нешта сур'ёзна разважаў... «Пад'ехаў цягнік, ён заходзіць побач са мной у вагон — і тут жа мяняецца проста на вачах, — са здзіўленнем расказвала знаёмая. — Закочвае вочы, нібы ён сляпы ад нараджэння, ідзе па вагоне і добра пастаўленым голасам вядзе слёзную гаворку пра дзіця, якое памірае. Людзі не скупіліся: даставалі грошы і падавалі яму. Ён змог ледзь не выбіць слязу ў добрай паловы вагона! На наступным прыпынку мы разам выйшлі. Чалавек зноў памяняўся ў тварыі стаў падобны на самага звычайнага грамадзяніна, выглядам — нібы менеджара сярэдняй рукі, і вочы вярнуліся на месца...»

Дарэчы, Алена Кулікова сама 24 гады прапрацавала з інвалідамі і ведае, як выглядае пасведчанне інваліда і калі, як і з якой нагоды людзі атрымліваюць яго. «І калі чалавеку сапраўды патрэбны грошы на лячэнне, то ён зможа дакладна і адэкватна расказаць пра захворванне, — упэўненая яна. — А людзі, што стаяць са слёзнымі плакатамі, часта не ведаюць нюансаў хваробы, на якую спасылаюцца, блытаюцца ў дэталях, трымаюць перад сабой пасведчанне інваліда, а самі не разбіраюцца нават у групах інваліднасці...»

— Неяк я нават зайшла ў міліцыю (аддзяленне знаходзіцца на шляху дадому) і пацікавілася, чаму яны дапускаюць усё гэта жабрацтва, зразумела ж, што гэта «развод» чыстай вады, — дзеліцца наша суразмоўніца. — Дзяжурны мне адказаў: мы ўсё разумеем, але не маем права штосьці з імі зрабіць, таму што яны не хапаюць вас за рукі. Вось калі б хапалі за падол паліто і прасілі грошы, тады можна было б іх затрымаць. А так — гэта ваша права: хочаце, кідайце грошы, хочаце — не.

Як ставіцца да такіх людзей?

Такіх жабракоў апошнім часам развялося нямала. Але мы зараз наўмысна не разглядаем выпадкі, калі жабруюць цыганскія дзеці або на вуліцы падыходзіць чалавек са словамі «абакралі, не магу паехаць дадому, дапамажыце купіць білет». Не разглядаем жабракоў і алкаголікаў, якія сядзяць каля метро і збіраюць на выпіўку. Гэта больш-менш зразумелыя выпадкі, і мы адварочваемся або стараемся хутчэй «адкупіцца» ад гэтых людзей. Хоць, напрыклад, Ніцшэ лічыў, што чалавек — і які падае, і які не падае міласціну — у любым выпадку будзе лічыць сябе крыху вінаватым: падасі, значыць, у матэрыяльным сэнсе ты жывеш лепш, у чым і вінаваты перад гэтым чалавекам, не падасі — значыць, пашкадаваў некалькі капеек і пакінуў у бядзе, таксама дрэнна.

У гэтым артыкуле мы закранулі толькі выпадкі, калі жабракі выкарыстоўваюць «цяжкую артылерыю» — фразы, якія б'юць наводмаш, міма якіх не атрымліваецца прайсці абыякава, таму што яны аб самым дарагім: здароўі дзяцей, жыцці і смерці, нашых глыбінных страхах...

Гэтыя людзі «ціснуць» на наша шкадаванне і дамагаюцца сваёй мэты, бо многія з нас, напрыклад, з інваліднасцю не сутыкаліся і не разбіраюцца ў гэтым. Але тыя, якім сапраўды патрэбны грошы на лячэнне, не будуць стаяць на вуліцы з плакацікам. Яны будуць шукаць нейкія іншыя спосабы. Бо, стоячы на вуліцы з працягнутай рукой, наўрад ці можна сабраць на аперацыю, нават калі чалавек і не падманвае і жабруе менавіта з гэтай мэтай.

Таму, можа, лепшай дапамогай будзе, калі неабыякавы мінак падкажа, што ёсць і іншыя спосабы прасіць. Напрыклад, хоць бы звярнуцца ў сродкі масавай інфармацыі, дзе можна размясціць нумар разліковага рахунку для пералічэння грашовых сродкаў. Але пры гэтым трэба, вядома, падаць дакументы, якія сведчаць аб тым, што гэта не афёра. Для гэтых жа мэт існуюць і дабрачынныя фонды...

Так што хочаце дапамагчы хвораму дзіцяці — пералічыце грошы на рахунак у банку, які без адпаведных медыцынскіх дакументаў проста не адкрыюць. Рабіць добра лепш правільна — так, каб дапамога даходзіла да тых, хто сапраўды ў ёй мае патрэбу.

Святлана БУСЬКО.

● **Наш каментарый**

А што кажа міліцыя?

У расійскай прэсе можна сустрэць публікацыі пра тое, што ў буйных расійскіх гарадах папрашайніцтва стала крымінальным бізнесам, у якім круцяцца вялікія грошы. Беларускія праваахоўнікі сцвярджаюць, што ў нашай краіне гаворка аб арганізаванай злачыннасці ў гэтай сферы не ідзе.

— Такіх даных у нас няма, хоць адзінкавы выпадак злачыннай групоўкі нядаўна быў выяўлены ў Магілёве, — заявіў «Звяздзе» **начальнік упраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Беларусі Алег КАРАЗЕЙ.** (Маецца на ўвазе выпадак з 25-гадовым ураджэнцам Рэчыцкага раёна, які жыў за кошт таго, што прымушаў людзей жабраваць для яго, — пра гэта наша газета пісала 29 жніўня гэтага года. — **Заўв. аўт.**).

Але ў цэлым кожны з тых, хто просіць міласціну, дзейнічае ў асноўным у адзіночку, лічыць Алег Каразей.

— Пра людзей, якія займаюцца папрашайніцтвам, можна сказаць, што яны знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі і просяць дапамагчы, — гаворыць начальнік упраўлення прафілактыкі МУС. — З пункту гледжання закона за гэта адказнасці не прадугледжана. Іншая рэч, калі гаворка ідзе пра назойлівае прыставанне, тады гэтыя дзеянні можна кваліфікаваць па артыкуле 17.1 як дробнае хуліганства. Яны цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад 2 да 30 базавых велічынь або адміністрацыйны арышт да 15 сутак.

У шэрагу выпадкаў людзі злоўжываюць дабрынёй мінакоў і падманваюць іх. Тады іх дзеянні можна кваліфікаваць як махлярства, гэта артыкул 209 (авалоданне маёмасцю або набыццё права на маёмасць шляхам зману або злоўжывання даверам). Такія дзеянні цягнуць пакаранне ад штрафу да папраўчых работ або пазбаўлення волі ў залежнасці ад абставін. (І дарэчы, у цяперашні час следчае ўпраўленне УСК па Віцебскай вобласці расследуе крымінальную справу аб махлярстве: абвінавачваная, жыхарка Мінскай вобласці, прыдумляла гісторыі пра смерць сваякоў, спрабуючы разжаліць людзей, якія аддавалі потым ёй грошы, а яна выдаткоўвала іх на спіртное і прадукты. — **Заўв. аўт.**).

Мы ў шэрагу выпадкаў атрымліваем скаргі ад грамадзян на людзей, якія займаюцца папрашайніцтвам у метро, пераходах, але тут трэба разглядаць кожную сітуацыю асобна.

Я лічу, што неабходна паведамляць нам пра сітуацыі, калі людзі для атрымання міласціны выкарыстоўваюць малалетніх дзяцей, у тым ліку грудных. Калі грамадзянін заяўляе, што ў яго настолькі гаротнае становішча, што няма чым карміць дзіця, значыць, неабходна ставіць пытанне аб разглядзе сітуацыі ў гэтай сям'і. Дзяржава павінна аказаць ёй дапамогу. Калі сям'я ў прынцыпе не выконвае сваіх функцый па выхаванню дзіцяці і клопаце аб ім, забеспячэнні яму мінімальна неабходных умоў, трэба ставіць пытанне аб адабранні дзіцяці з такой сям'і. Такія скаргі да нас паступаюць, і мы рэагуем на іх, прымаем меры па абароне дзяцей — аж да пазбаўлення бацькоўскіх правоў, калі будзе пацверджана, што не забяспечваюцца мінімальныя патрэбы дзіцяці.

Але ў асноўным гэта проста выпадкі, калі асобныя людзі знайшлі такі спосаб атрымліваць сродкі для пражывання. Хоць ёсць жа і іншыя спосабы. Калі ў чалавека сапраўды складанае становішча, дапамогу яму акажа дзяржава. Гаворка можа ісці і пра матэрыяльную дапамогу і дапамогу ў аднаўленні дакументаў пры неабходнасці — афармленне пенсіі, выдзялення месца ў спецыяльных цэнтрах для асоб без пэўнага месца жыхарства і г. д. Кожны грамадзянін, які знаходзіцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, мае права на сацыяльныя паслугі, і наша дзяржава іх аказвае.

■ Далікатная тэма

«У ПАНЯДЗЕЛАК МЯНЕ ЎЖО НЕ БУДЗЕ...»

Як дапамагчы таму, хто сабраўся звесці рахункі з жыццём

Як зразумець, што блізкі чалавек гатовы спыніць сваё жыццё? Ці варта размаўляць з ім пра гэта і ўвогуле як сябе паводзіць, калі падлетак ці дарослы выказвае намер здзейсніць суіцыд? З якіх міфаў складаецца наша ўяўленне пра самагубства? Пра гэта расказала ўрач-псіхіятр-нарколаг Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Наталля ГРАЧЫШЫНА.

— Чалавек, які адважыўся на самагубства, адчувае глыбокае гора, моцны душэўны боль, часта пачуццё немагчымасці справіцца са сваімі праблемамі, — тлумачыць Наталля Анатолеўна. — Нягледзячы на даволі вялікую колькасць інфармацыі на гэту тэму, у нас існуе мноства міфаў і забабонаў. Вось асноўныя з іх.

МІФ: «Тыя, хто кажа пра самагубства, рэдка яго здзяйсняюць».

ФАКТ: 90 % памерлых ад самагубства перад здзяйсненнем суіцыду прыводзяць важкія слоўныя доказы сваіх намераў, 40 % — звяртаюцца да спецыялістаў. Гэта значыць, амаль кожнаму суіцыду папярэднічаюць сігналы аб гатоўнасці да такога ўчынку. Калі хтосьці кажа пра здзяйсненне самагубства, размова хутчэй за ўсё ідзе пра папярэджанне або гэта «крык аб дапамозе».

Міф: «Калі чалавек кажа пра самагубства, ён імкнецца прыцягнуць да сябе ўвагу».

ФАКТ: чалавек, які кажа пра суіцыд, адчувае востры псіхалагічны боль і хоча паведаміць пра гэта важным для яго людзям.

Міф: «Тыя, хто робіць спробу самагубства, хочуць памерці».

ФАКТ: пераважная большасць хоча не смерці, а пазбаўлення ад невыноснага псіхалагічнага болю.

Міф: «Нічога не змагло б спыніць таго, хто прыняў рашэнне пакончыць з сабой».

ФАКТ: большасць людзей, якія абдумваюць магчымасць самагубства, хочуць, каб іх пакуты скончыліся, і імкнуцца знайсці альтэрнатыву ці шляхі аблягчэння болю.

Міф: «Рызыка самагубства знікае, калі крызісная сітуацыя прахадзіць».

ФАКТ: пад знешнім спакоем можа хавацца цвёрда прынятае рашэнне, а некаторы пад'ём сіл пасля вострага крызісу, які мінуў, толькі дапамагае здзейсніць задуманае.

Міф: «Размовы пра самагубства могуць садзейнічаць яго здзяйсненню».

ФАКТ: абмеркаванне суіцыдальных настрояў суразмоўніка насамрэч дэманструюць яму, што хтосьці гатовы зразумець і раздзяліць яго боль. Размова можа стаць — і часта становіцца — першым крокам у папярэджанні суіцыдаў.

Міф: «З дэпрэсіяй можна справіцца намаганнем волі».

ФАКТ: заклікі накшталт «Вазьмі сябе ў рукі!», «Будзь мужчынам!» і іншыя толькі зніжаюць самаацэнку, паколькі свядома кантраляваць дэпрэсію не ўдаецца.

Міф: «Дзеці суіцыдаў не здзяйсняюць: ім рана».

ФАКТ: у бальніцы раз-пораз трапляюць дзеці самых розных узростаў, якія свядома здзейснілі спробы самагубства.

— Завершаны суіцыд, на вялікі жаль, нельга выправіць, аднак яго можна папярэдзіць, галоўнае — быць уважлівымі да навакольных, — кажа Наталля Грачышына. — Існуюць арыенціровачныя «ключы», знакі, якія паказваюць на магчымасць суіцыдальнай актыўнасці.

ЗНАКІ СУІЦЫДАЛЬНАЙ РЫЗЫКІ

- прамыя пагрозы «Я збіраюся пакончыць з сабой», «У наступны панядзелак мяне ўжо не будзе ў жывых» ці ўскосныя пагрозы «Без мяне жыццё не пагоршыцца» ці «Часам хочацца пакончыць з усім гэтым раз і назаўсёды»;
- нечаканыя змены настрою;
- нядаўняя цяжкая страта;
- раздаванне любімых рэчаў;
- навядзенне парадку ў справах, раздача даўгоў;
- страта самапавагі;
- самаізаляцыя.

Калі ў вас узнікла нават нязначнае падазрэнне наконт магчымасці суіцыду або ёсць цяжкія асабістыя праблемы, не пакідайце чалавека сам-насам і не заставайцеся ў адзіноце. Самае лепшае — звярнуцца па дапамогу да спецыяліста — псіхолага, псіхатэрапеўта, псіхіятра-нарколага, якія своечасова акажуць кваліфікаваную дапамогу.

Алена КРАВЕЦ

■ Добрай ночы!

Пераначуем — болей пачуем

Урач-самнолаг пра здаровы сон

Сон патрэбен чалавеку не толькі для таго, каб адчуваць сябе бадзёра, але і для таго, каб прымаць верныя рашэнні, гаворыць народная мудрасць. А яшчэ, хоць гэта не падаецца відавочным, людзі, якія не прытрымліваюцца здаровага сну, схільныя да павелічэння масы цела і атлусцення. Сацыяльныя сеткі, серыялы сезонамі запар, праца ўначы і іншае забіраюць каштоўныя гадзіны на сон. Пра тое, наколькі важна класціся спаць своечасова, а таксама чаму нельга на ноч чытаць са смартфона, адказала ўрач-самнолаг Наталля ШЫЛАВА.

— Мужчыны і жанчыны маюць патрэбу ў аднолькавай колькасці сну?

— Ёсць даныя, згодна з якімі мужчыны і жанчыны павінны спаць аднолькавую колькасць часу. Цяжарныя жанчыны маюць патрэбу ў сне большую, чым мужчыны, на гадзіну-паўтары. Увогуле сярэдняя патрэба ў сне ў дарослага чалавека складае 7-8 гадзін, але лепш за ўсё падыходзіць да пытання яго працягласці індывідуальна. У кожнага чалавека, незалежна ад полу, свая патрэба ў сне, якая мяняецца з узростам. Калі нованароджанае дзіцятка спіць 22—23 гадзіны ў суткі, то для пажылога чалавека досыць бывае і пяці гадзін. Часам людзі звяртаюцца па медыцынскую дапамогу пры зніжэнні працягласці сну, але на самай справе іх сон не парушаны, скараціўся яго час — людзі памылкова ўспрымаюць тое, што яны сталі менш спаць, як нейкі трывожны знак.

«Калі чытаць перад сном з яркага экрана на працягу многіх гадоў, то гэта можа прывесці да парушэння цыркаднага рытму, што ў сваю чаргу негатыўна адаб'ецца на здароўі».

— Калі класціся спаць, каб раніцай прачнуцца добра адпачнуўшы?

— Здараецца, чалавек правёў у ложку дастатковы час, але калі прачнуўся, адчувае сябе не вельмі добра. Наш стан раніцай залежыць ад таго, у колькі мы лягі і ў колькі падняліся, і таксама ад таго, якія фазы сну прайшлі за ноч і ў якую фазу сну чалавек прачнуўся. Вылучаюць дзве асноўныя фазы: павольнага сну і хуткага сну. Першая характарызуецца поўным расслабленнем мышцаў, запаволенням сардэчна-сасудзістай дзейнасці, дыхання. З псіхалагічнага пункту гледжання ў гэтую фазу сну адбываецца раскладванне па паліцах атрыманай інфармацыі. Менавіта таму ў народзе кажуць: пераначуем — болей пачуем. Услед за фазай павольнага сну надыходзіць фаза хуткага сну, калі адбываецца актывацыя ўнутраных органаў і сістэм, паскараецца сэрцабіццё, пачашчаецца дыханне, самае галоўнае, адбываецца актывацыя вокарухальных мышцаў — пачынаюць рухацца вочы. З псіхалагічнага пункту гледжання гэтая фаза характарызуецца снамі. Сны — гэта прапрацоўка неўсвядомленага матэрыялу. За ноч фазы павольнага і хуткага сну чаргуюцца прыкладна чатыры-шэсць разоў. Патэрн — фаза павольнага і хуткага сну — якраз і доўжыцца прыкладна 1,5-2 гадзіны. У першай палове ночы большыя і даўжэйшыя фазы павольнага сну. У другой палове ночы фазы хуткага сну становяцца даўжэшымі. Калі класціся спаць пасля поўначы, то, колькі б мы ні спалі, будзем адчуваць сябе стомленымі, таму што было недастаткова часу на перапрацоўку ўсёй інфармацыі, якая паступіла за дзень. Таму добра было б класціся не пазней як за гадзіну да поўначы, лепш — за дзве. Калі чалавек прачынаецца ў фазу павольнага сну, ён адчувае сябе стомленым, быццам не выспаўся. Калі прачынаецца ў фазу хуткага сну, адчувае сябе бадзёра. Увогуле сам арганізм дыктуе нам гэты час абуджэння. Калі мы своечасова ляглі, ноч спалі і не прачыналіся, то мы самі прачнёмся ў фазу хуткага сну.

— Як рэжым сну звязаны са светлавым днём?

— Менавіта ў цёмны час сутак выпрацоўваецца гармон мелатанін, патрэбны для фарміравання фаз сну. Як толькі надыходзіць светлы час

сутак, як бы мы ні зацямнялі свой пакой (хоць гэта крыху можа дапамагчы), але прыроду падмануць цяжка, — выпрацоўка мелатаніну зніжаецца. У ранішнія гадзіны выпрацоўваюцца гармоны шчытападобнай залозы, наднырачнікаў, якія актывуюць наш арганізм. Таму мы і прачынаемся раніцай пасля таго, як гэтыя гармоны пачынаюць дзейнічаць. Калі ж мы спрабуем спаць далей, то ўжо трацім свае сілы на сон. Гармоны нам кажуць, што трэба ісці працаваць, а мы ўсяляк супраціўляемся, спрабуем зноў заснуць.

— На выхадных можна адсыпацца?

— Спаць «у запас» не атрымаецца. Максімум, да чаго гэта прывядзе, — у наступную ноч мы яшчэ пазней заснём. Рэжым сна збіваецца.

— Чаму так важна класціся і прачынацца ў адзін і той жа час?

— Калі мы будзем сёння класціся а 10-й вечара, заўтра на дзве гадзіны пазней, то паслязаўтра нам будзе цяжка зноў заснуць у 22 гадзіны. Арганізму складана засынаць у розны час, будзе развівацца бяссонніца.

— Што рабіць, каб хутчэй заснуць?

— У норме ў здаровага чалавека сон наступае праз 30—40 хвілін пасля таго, як ён лёг. Большасць актыўных людзей засынае ўжо праз 10—15 хвілін. Калі ж сон не наступае на працягу 40—60 хвілін і гэта адбываецца больш чым тры разы на тыдзень і паўтараецца не менш за два тыдні, то гэта ўжо бяссонніца. Такому чалавеку я рэкамендавала б звярнуцца да спецыяліста, урача-псіхатэрапеўта, самнолага для таго, каб пашукаць прычыны парушэння сну. Дарэчы, сексуальная актыўнасць спрыяе сну. Падчас палавога акта выпрацоўваюцца гармоны задавальнення — эндарфіны, якія спрыяюць паляпшэнню сну. А вось чытанне са смартфона перад сном — шкодзіць. Сіні колер экрана, трапляючы на сятчатку вока, тармозіць выпрацоўку гармону мелатаніну, які выклікае сон. Калі чытаць перад сном з яркага экрана на працягу многіх гадоў, то гэта можа прывесці да парушэння цыркаднага рытму, што ў сваю чаргу негатыўна адаб'ецца на здароўі. Перад сном лепш чытаць кнігу з электроннымі чарнілами або папяровую, бо вечарам мозг асабліва адчувальны да сіняга колеру.

— Ці варта спаць днём?

— Дзённы сон дазволены ў тым выпадку, калі ён не парушае начны. Лічыцца, калі чалавек моцна стаміўся, нават калі ён задрэмле на 10—15 хвілін, то гэтага ўжо дастаткова, каб ён набраўся бадзёрасці і правёў рэшту дня ў актыўным стане.

— А праўда тое, што спаць трэба галавой на поўнач?

— Я вялікі рэаліст. Лепш выконваць гігіену сну, чым думаць пра размяшчэнне бакоў свету. На мой погляд, такое сцверджанне не мае падстаў.

— Чаму так складана ўставаць у пахмурнае надвор'е?

— Таму што няма сонечных прамянёў, якія ўзбуджальна дзейнічаюць на ўнутраныя сістэмы арганізма. Мы не адчуваем сябе актыўнымі. Дзейнічаюць усё тыя ж цыркадныя рытмы.

— Якія наступствы ў недасыпання?

— Калі чалавек спіць рэгулярна па 3-4 гадзіны ў суткі, што для яго арганізма недастаткова, то гэта будзе адбівацца як на фізічным, так і на псіхалагічным стане. Найперш гэта стомленасць, дыскамфорт, пачуццё цяжару ў галаве, галаўныя болі, галавакружэнне, перапады артэрыяльнага ціску, дыскамфорт у вобласці сэрца, сухасць у вачах і іншае. Што датычыцца псіхалагічнага стану, то запавольваецца мысленне і зніжаюцца кагнітыўныя функцыі: памяць, канцэнтрацыя ўвагі.

Калі чалавек кажа, што ўжо цэлы месяц не спаў, — так не бывае. Тут стаіць пытанне аб тым, што ён не адчувае адпачынку пасля сну, няправільна былі сфарміраваныя яго фазы.

Людзі, у якіх не сфарміраваныя фазы сну, схільныя да павелічэння масы цела і атлусцення. Падчас сну выпрацоўваецца асаблівы гармон лепцін, які адказвае за пачуццё насычэння. Калі ўначы мы дрэнна спім і гармон не выпрацоўваецца, то днём нам трэба больш з'есці. Магчыма, шэраг людзей і заўважалі за сабой: чым менш паспаў, тым больш хочацца есці.

Наталля ПАЎЛЮКЕВІЧ

■ Жыццёвінкі

ДОБРА, ДЗЕ НАС НЯМА

АЛЕГ рос адзіным дзіцем у сям'і настаўнікаў. Інтэлігентныя бацькі праяўлялі да яго такі клопат, якому маглі б пазайздросціць у многіх іншых сем'ях. У адрозненне ж ад апошніх яны не забывалі і пра тое, што падлетку, калі ў яго фарміруецца характар, неабходна пастаянная запрэжка — як разумовая, так і фізічная. Гэтага крэда Пётр Сямёнавіч і Алена Паўлаўна цвёрда прытрымліваліся, адначасова не прыгнятаючы яго жаданні і волю. Напэўна, таму ў адрас Алега ніхто не мог сказаць, што ён — мамчын сынок, на якога бацькі баяцца дыхнуць, каб, крый божа, не сапсаваць яго настрой ці выклікаць яго незадавальненне.

Напрыклад, калі хлопец задумаў пайсці спачатку ў спартыўную секцыю па гімнастыцы, не пярэчылі яму. Гэтак жа было, калі ён падаўся ў бокс. Бацька, як былы спартсмен, папярэджваў яго — гэта не тваё, — але адгаворваць не стаў. Маўляў, паспрабуй, памацай усё, паспытай на сабе, зрабі самастойны выбар, каб потым не шкадаваць. Сапраўды, Алег не затрымаўся і там.

А той выбар прыйшоў неўзабаве, сам сабою. У пятым класе хлопец запісаўся ў секцыю па грэка-рымскай барацьбе, а ў дзясятым, выпускным, стаў кандыдатам у майстры спорту. Улічваючы яшчэ і тое, што ў школе ён вучыўся на чацвёркі і пяцёркі, перад ім адкрываліся шляхі-дарогі для паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову, у чым яго жаданне супала з жаданнем бацькоў.

Але вось якая ВНУ — трэба было думаць. Таму што ў тыя савецкія часы многія інстытуты ды акадэміі стараліся займець перспектыўных спартсменаў, якім (чаго граху таіць?) дапамагалі здаць іспыты. Дык вось, Алегу нават прапановы паступаць пачалі з некаторых навучальных устаноў, чаму ён не толькі здзівіўся, але і зрабіў выснову: ён, аказваецца, «каштоўны кадр». Куды да яго сябрам-аднакласнікам, якія з цэлай нізкай «траякоў» у атэстатах сталасці будуць дрыжаць пры паступленні ў прафтэхвучылішчы!

Між тым узрослая самаацэнка не перашкаджала Алегу браць вышыню за вышынёй як у вучобе, так і ў спорце: стыпендыя ў педагагічным інстытуце яму была забяспечана па зразумелай прычыне (толькі добрыя і выдатныя ацэнкі). І ў спорце — поспех: яго ўключылі ў склад зборнай вобласці і нават рэспублікі.

Усё ішло добра, калі не лічыць адной стрэмкі, якая пачынала «калоць» яго. Сустрэўшыся са сваімі сябрамі-пэтэвэшнікамі, ён даведаўся, што ў час вытворчай практыкі на «Гомсельмашы», станкабудаўнічым заводзе імя Кірава і хімічным ім плацілі такія сумы, якія пераўзыходзілі месячныя заробкі яго бацькоў. А гэта азначала, што такая аплата пасля заканчэння інстытута будзе чакаць і яго. Дык ці справядліва гэта, каб троечнікі былі ў большай пашане, чым выдатнікі?

Паступова ў галаву хлопца ўпаўзла думка: пасля другога курса кінуць інстытут і пайсці на завод. Там навучаць рабочай спецыяльнасці, там будзе дастойны заробак. Пра што не, не ды і загаворваў з бацькамі. Тыя добра ведалі характар сына: калі што задумае — рана ці позна зробіць. Угаворванні тут не дапамогуць. Таму дамовіліся паміж сабой: няхай пакаштуе рабочага хлеба.

Сказалі ж яму наступнае. Не хапае крыху грошай, каб купіць легкавушку. Каб не залазіць у крэдыт, ці не зможа Алег дапамагчы ім: на адзін месяц скараціць знаходжанне ў летнім спартыўным лагеры і недзе папрацаваць. Той з душой прыняў прапанову бацькоў, паставіўшы такую ўмову: каб быць свабодным у васьмнаццаць гадзін, калі сонца яшчэ высока і будзе магчымасць загараць і купацца ў Сожы разам з сябрамі.

Першая і другая прапановы Пятра Сямёнавіча і Алены Пятроўны стаць грузчыкам у магазіне і працаваць на піларараме не падышлі, а вось трэцяя Алегу спадабалася: работа на асфальтабетонным заводзе.

Пра тое, як прайшоў у Алега першы тыдзень на рабоце, ён расказваў бацькам стрымана. Дым, смурод, шухлі-лапаты і г. д. Цяжкавата, але цярпець можна. Тады ж прывёз такую замурзаную робу, што маці ледзь адшкрэбла яе ад бруду. Пасля другога тыдня расказаў, што ў брыгадзе адзін дзівак ёсць. Паўтараметрам яго клічуць. З-за невялікага росту. У паўтары змены ўкалвае. Худы як шчэпка. Бо дурань: чацвёрты раз ажаніўся. Тром жонкам аліменты на дзяцей выплачвае. Пасля трэцяга тыдня апавядаў, як двое мужыкоў у час абедзенага перапынку недзе ў кустоўі прынялі спіртное і заснулі. А калектыў — на брыгадным падрадзе. Дык ім прэмію ўрэзалі і так прачысцілі на сходзе, што доўга памятаць будуць.

Больш нічога цікавага на заводзе Алег не знайшоў. Па яго настроі было відаць, што ў гэтай рабоце ён расчараваўся, нягледзячы на тое, што зароблена ім за месяц сума сапраўды перавысіла месячную зарплату бацькоў. За гэтыя грошы Алегу купілі японскі магнітафон. Ды гэта не такі важны ўжо факт.

А Пятра Сямёнавіча і Алену Пятроўну ўзрадавала тое, што хлопец, апынуўшыся ў рабочым асяродку, пачаў разумець, што да чаго: рыба шукае, дзе глыбей, а чалавек — дзе лепей.

...Праз тры гады Алег атрымаў чырвоны дыплом. Узрост сам ведаеш які. А ты...

— А я — малы яшчэ, каб цягаць такі груз, — перабівае яе Васёк і спрабуе «дабіць» бабулю наступным аргументам: — Хіба не ты ўвесь час гаварыла, што вельмі любіш мяне, а зараз што — адмаўляешся?

— Ды не, не адмаўляюся, люблю цябе, дзіцятка, — пачала апраўдвацца бабуны момант. Здарылася так, што, вяртаючыся пад вечар да прыпынку дызеля, я зноў убачыў у сябе наперадзе бабулю і яе ўнука. Яна несла два пакеты з агурочкамі і памідорчыкамі, а Васёк з туга набітым заплечнікам то борздка імчаў на самакаце, то перакідваў яго з рукі ў руку, калі ехаць было немагчыма. Таго незнаёмага мужыка побач з імі не было. А ў іхніх думках, напэўна, ён усё ж застаўся...

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

САМАКАТ

ЗПРЫГАРАДНАГА цягніка Гомель — Клёнкі — Гомель крочу да сваёй дачы. Напарадзе чыкільгае бабуля, у якой заняты дзве рукі, а ў дадатак яшчэ — заплечнік. Побач з ёй весела шыбуе на самакаце гадоў шасці-сямі, відаць па ўсім, даволі дужы для свайго ўзросту хлапчына. Дарога добра ўтаптаная, таму хлопчык без лішніх фізічных высілкаў можа паскараць язду. Але вось дарога ў жаўтапёсак, які некалькі дзён таму патокамі праліўнога дажджу павыбівала з пагорка.

Самакат, натуральна, «забаставаў», і малы адразу спахмурнеў: трэба самому станавіцца конікам, упрагацца ў той вазок. Бо напарадзе, як кінуць вокам, той жа пясок-сыпун, які «раскоўзалі»-размясілі машыны ды матацыклы.

Хлапчына, аднак, не губляецца:

— Вазьмі самакат, баба, — кажа патрабавальным тонам, які мяне вельмі здзівіў.

— Куды, Васёк? Рукі ж, сам бачыш, занятыя.

— Пакеты — у адну руку, самакат — у другую, — выкладвае «рацыяналізатарскую» прапанову ўнучак.

— Мне і без твайго самаката цяжка, — уздыхае жанчына, прыхінуўшыся, каб адпачыць, да дуба. — ля, прымаючы той самакат і, напэўна, прыкідваючы ў думках, як лепш прыладкаваць яго да сваіх рэчаў, каб дагадзіць унуку.

— Ну вось і добра, — адразу павесялеў той. — Толькі не капайся, як курыца.

Быўшы выпадковым сведкам убачанага і пачутага, я хацеў умяшацца ў размову старой і малога. Ды не паспеў, бо апярэдзіў незнаёмы мужык, што таксама крочыў услед за імі.

— Падстаўляй, баба, горб, — заявіў ён ёй. — Падсаджу на яго твайго Васька, каб вазіла яго. Век пражыла, а не ведаеш, што дзяцей трэба змалку прывучаць да працы і да павагі, каб потым не плакаць ад іх эгаізму. Што нельга патураць ім пры кожным капрызе. А ты, лайдак (гэта ўжо да апошняга), запомні на ўсё жыццё: любіш катацца — любі і саначкі вазіць.

Грозна зірнуўшы на Васька, ён тут жа распарадзіўся:

— Бабулін рукзак — сабе за спіну, самакат — у рукі і марш наперад!

Хлапчына шмаргануў носам і, адразу стаўшы паслухмяным, паплёўся па дарозе. Мужык рушыў за ім.

Можна па-рознаму каментаваць апісаную сітуацыю, разглядаць плюсы і мінусы гэтага выхаваўчага «працэсу», калі б не наступпад двума вялікімі мяшкамі, загружанымі пустымі пластмасавымі бутэлькамі. І вось — на табе! Трэці мяшок прыпёр сюды на вачах Паўла Макаравіча, хто б вы думалі, — Валерка!

— Навошта? — пацікавіўся ў яго Сабулдыжкін.

— Як навошта? — здзівіўся хлапчук. — Каб здаць і атрымаць грошы. На кіно ці марожанае.

Эге, пульсанула думка ў галаве выпівохі: брахнёй

КАНАДЗЕЦ ВАЛЕРКА ПРЫЕХАЎ У ГОСЦІ...

ВО РАДАСЦІ было ў Сцяпана Мікітавіча і Марыі Канстанцінаўны, калі ў госці да іх прыехала Святлана. Ды не адна, а з сынам Валеркам. З Канады, у якой яна пасялілася пятнаццаць гадоў таму разам з мужам Іванам. Раней жылі яны ў Гомелі, дзе нарадзілі дачку Люду, а Валерку прыдбалі ўжо там, у Манрэалі. Маладая сям'я чатыры разы наведвалася да родных, а вось сёлета Святлана з'явілася да іх з Валеркам. Нагодай для гэтага стала сустрэча з аднакласнікамі.

Калі суседзі па дзевяціпавярховіку не, не ды цікавіліся ў Пятровых (прозвішчы ўсе зменены), як там за акіянам жывецца сям'і Сінягрыбавых, адказ быў адзін: добра. Святлана працуе настаўніцай у школе з месячным заробкам у тры тысячы канадскіх долараў, а Іван — механікам у нейкай фірме з яшчэ нашмат большай зарплатай. Люда вучыцца ва ўніверсітэце, а Валерка ходзіць у школу. Сям'я будуе ў прыгарадзе катэдж на дзесяць пакояў, узяўшы ў дзяржавы крэдыт пад чатыры працэнты гадавых.

Адны суседзі па-добраму радаваліся за Пятровых і Сінягрыбавых, другія — употайкі зайздросцілі ім. Ды на здароўечка гэта, калі б не адзін выпадак, які сапсаваў настрой Сцяпану Мікітавічу і Марыі Канстанцінаўне. А пачалося ўсё з таго, што сусед Пятровых па лесвічнай пляцоўцы Павел Макаравіч у прызначаным згодна з праектам памяшканні для збору смецця прыхоўваў ад сварлівай жонкі пляшку пладова-ягаднага віна. Нырнуўшы туды, глыне таго «чарніла» — і ходу назад. А тут што атрымалася? Тое месца, дзе знаходзілася пляшка, аказалася займаюцца Сцяпан Мікітавіч і Марыя Канстанцінаўна. Не салодка жыць іхнім канадцам у чужой краіне. Калі не жабракі, дык бядотнікі! Не могуць выдзеліць хлапцу пяцёрку якую на білет у кіно.

Такая вось пагалоска і пайшла гуляць спачатку па тым пад'ездзе, у якім жывуць Пятровы і Сабулдыжкіны, а затым і па ўсіх астатніх чатырох. Калі дакацілася яна да Сцяпана Мікітавіча і Марыі Канстанцінаўны, яны сталі прасіць Святлану, каб яна забараніла Валерку збіраць тыя бутэлькі. Але дачка заўпарцілася і сказала, што, як і ў Канадзе, яе сын займаецца карыснай справай, бо прывучаецца да працы. Як і Люда, якая ў час летніх канікулаў наймаецца ў рэстаран ці кафэ мыць посуд. Там, за акіянам, дзецям на лета знаходзяць занятак, каб яны не швэндаліся без справы, не білі шкляную тару, не пісалі нецэнзуршчыну на сценах дамоў, як гэта часцяком назіраецца ў нас.

Не магу сказаць, правільна ці няправільна зрабіла Святлана, калі ўпотайкі ад бацькоў з паўлітэркай гарэлкі завітала да Паўла Макаравіча, калі яго жонкі не было, і, не прыгадваючы, што два ягоныя сыны пры патуранні бацькоў ударыліся ў гультайства і дакаціліся да турмы, паставіла яму гэту пляшку. Дамовіўшыся, што той пагалосцы, якую ён пусціў, дасць зваротны ход, чэсна расказаўшы насельнікам дома, чаму яе Валерка так рабіў.

І што вы думаеце: спрацавала! Сабулдыжкін, трэба аддаць тут яму належнае, стрымаў дадзенае слова і нават знайшоў у сабе сілы папрасіць прабачэння ў сваіх суседзяў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

На основании пункта 14 Положения о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков», пункта 1 статьи 40 Закона Республики Беларусь от 4 января 2010 года «О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь», Малоритский районный исполнительный комитет решил отказаться от проведения 19 сентября 2018 года аукциона по продаже земельных участков в частную собственность. 4. Контроль за выполнением настоящего решения возложить на отдел экономики Малоритского райисполкома, финансовый отдел Малоритского райисполкома и отдел землеустройства Малоритского райисполкома.

УНП 200077927

■ На шляху ў СГА

Захаваць эканоміку і застацца адкрытымі

Дзяржслужачыя вывучалі тонкасці правядзення дзяржзакупак па правілах пагаднення СГА

Далучэнне да пагаднення аб дзяржзакупках СГА — вельмі прадуманая і ўзважаная праца па забеспячэнні аховы найбольш уразлівых сектараў эканомікі. Пра гэта падчас Нацыянальнага семінара па дзяржаўных закупках, арганізаванага МАРГ сумесна з сакратарыятам Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА) і Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР), паведаміў **міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ**. Міжнародны семінар праводзіўся для прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, каб азнаёміць іх з прынцыпамі пагаднення яшчэ да таго, як краіна ўступіць у СГА.

«Сёлета ў чэрвені Беларусь зрабіла першы крок на шляху да ўступлення ў СГА. Краіна стала назіральнікам у пагадненні арганізацыі аб дзяржаўных закупках. Дадзеная працэдура была забяспечана тым, што ў краіне праводзіцца эфектыўная работа па ўдасканаленні кіравання сістэмай дзяржзакупак. Ужо праз два месяцы пасля атрымання статусу назіральніка Беларусь прымае ў сталіцы сусветных экспертаў. Удзельнікі семінара змогуць атрымаць адказы на ўсе актуальныя пытанні па дзяржаўных закупках», — адзначыў кіраўнік МАРГ.

Каментуючы перспектыву ўступлення Беларусі ў СГА, Уладзімір Калтовіч падкрэсліў, што далучэнне да пагаднення па дзяржзакупках, з аднаго боку, дазваляе атрымаць доступ да рынкаў краін-удзельніц і тым самым павялічыць свой экспартны патэнцыял. Айчынныя вытворцы змогуць на роўных удзельнічаць у закупках у многіх дзяржавах. З іншага боку, мы адкрываем свой рынак дзяржзакупак. Аднак перагаворы па далучэнні краіны да дагавора па дзяржаўных закупках будуць пачаты пасля ўступлення ў СГА.

«Да падпісання асноўных дакументаў мы зможам усталяваць механізм аховы эканомікі пры ўступленні ў СГА менавіта ў сферы дзяржаўных закупак. На гэта будзе накіравана праца нашых экспертаў», — растлумачыў Уладзімір Калтовіч.

Таксама міністр акцэнтаваў увагу на тым, што ў Беларусі ідзе рэфармаванне сістэмы дзяржзакупак. Паводле яго слоў, новы закон аб дзяржзакупках, які пачне дзейнічаць у краіне з першага ліпеня 2019 года, дасць магчымасць удасканаліць механізмы і забяспечыць празрыстасць, а таксама пашырыць магчымасці суб'ектаў па ахове сваіх правоў. Паводле слоў міністра, абноўлены закон, падпісаны Прэзідэнтам сёлета ў чэрвені, накіраваны на зніжэнне колькасці пасярэднікаў, што ўдзельнічаюць у працэдуры.

Акрамя таго, як адзначыў міністр, рынак дзяржзакупак краіны застаецца ёмістым. Паводле інфармацыі за 2017 год, кошт заключаных па выніках дзяржаўных закупак дагавораў склаў каля 2,8 млрд еўра, што эквівалентна больш як 6 % ВУП краіны. Разам з тым, па словах **прадстаўніка сакратарыята СГА Ганны Караліны МЮЛЕР**, у сярэднім у розных краінах велічыня гэтага рынку можа даходзіць да 15 % ад ВУП.

«Таму рынак цікавы і для краін, і для кампаній. Акрамя таго, сектар дзяржзакупак звязаны з буйнымі дзяржаўнымі інвестыцыямі ў інфраструктуру, школы, бальніцы — усё тое, што дае магчымасць мадэрнізаваць эканоміку, краіну і забяспечыць эканамічны рост. Гэтыя дзяржаўныя інвестыцыі патрэбны і насельніцтву, і кампаніям для эфектыўнай работы», — адзначыла Ганна Караліна Мюлер.

Таксама яна лічыць, што Беларусь за апошні час значна прасунулася ў тым, што датычыцца ўступлення ў СГА, і досыць прадуктыўна пачала дыялог па магчымым далучэнні да пагаднення аб дзяржзакупках, звязаны з уступленнем у арганізацыю. Гэта сведчыць аб прагрэсіўным падыходзе краіны.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■

■ Май на ўвазе!

МАЁМАСНЫ ПАДАТАК ЛЕПШ ЗАПЛАЦІЦЬ СВОЕЧАСОВА

Спецыялісты падатковага ведамства нагадваюць заможным беларусам аб гранічным тэрміне па аплаце маёмасных плацяжоў — зямельнага падатку, падатку на нерухомасць і арэнднай платы за зямлю. Крайні тэрмін аплаты збору — 15 лістапада. Тым, хто пратэрмінуе або забудзе ўнесці падатак, пагражаюць штраф і пеня. Тут парада нумар адзін ад падаткавікоў — аплаціць збор лепш адразу пасля атрымання дакументаў на рукі. Але бываюць складанейшыя выпадкі...

Калі па якой-небудзь прычыне не прыйшло паведамленне на выплату зямельнага падатку і збору на нерухомасць (напрыклад, згублена вамі), трэба звярнуцца ў падатковую па месцы знаходжання аб'екта нерухомасці, у тым ліку зямельнага ўчастка. Эксперты падатковай службы ўдакладняць суму падатку, якую трэба пералічыць у бюджэт. І яшчэ, паведамленне падатковай інспекцыі можна знайсці на старонцы «асабістага кабінета» на сайце падатковай альбо атрымаць па пошце.

Што будзе, калі не плаціць? Сумы падаткаў, якія не былі аплачаныя ў бюджэт добраахвотна, спаганяюцца ў прымусовым парадку праз суд з налічэннем пені за кожны каляндарны дзень пратэрміноўкі. За неаплату або няпоўную аплату накладаецца штраф у памеры 15 працэнтаў ад неаплачанай сумы падатку, але не менш за 0,5 базавай велічыні. Аплаціць падаткі можна праз АРІП, банк, пошту, сельскія (пасялковыя) Саветы, у падатковай інспекцыі і праз інтэрнэт-банкінг.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Супрацоўніцтва

ДАМЫ-ВЕТРАЗІ І ГРАНІТНАЯ НАБЯРЭЖНАЯ

У Санкт-Пецярбургу пачаліся Дні Мінска

Правядзенне Дзён Мінска за мяжой можна назваць традыцыйным. З 2013 года яны праходзілі ў Маскве, Рызе, Мілане, Санкт-Пецярбургу, Бялградзе і Омску. Геаграфія даволі шырокая. Сталіца Беларусі адкрыта для супрацоўніцтва і актыўна прасоўвае на знешні рынак свае культурныя і эканамічныя інтарэсы.

Што датычыцца цяперашніх Дзён, то, як паведаміў **Уладзімір НАВУМОВІЧ, старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама**, сёння прадугледжана сустрэча з губернатарам Санкт-Пецярбурга Георгіем Палтаўчанкам. У ходзе гэтай сустрэчы плануецца падпісаць план мерапрыемстваў — своеасаблівую «дарожную карту» па гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве паміж Мінскам і Санкт-Пецярбургам на 2018—2020 гады. Акрамя таго, кіраўнікамі раёнаў Мінска запланаваны сустрэчы з піцерскімі калегамі. Будзе падпісана пагадненне паміж адміністрацыяй Фрунзенскага раёна Мінска і Курортным раёнам Санкт-Пецярбурга.

12 адкрываецца пройдзе Форум дзелавога супрацоўніцтва, у рамках якога правядуць пленарнае пасяджэнне, дзе будзе прадстаўлены гандлёва-эканамічны і інвестыцыйны патэнцыял Мінска. Тут жа адбудзецца работа секцый «Гасцінныя Санкт-Пецярбург і Мінск» і «Разумныя гарады. Інфраструктура буйных гарадоў». У форуме возьмуць удзел вядучыя прадпрыемствы беларускай сталіцы.

Запланаваны паказ калекцыі беларускай моды — вырабаў з лёну, арганізаваны канцэрнам «Беллегпрам». Да 16 верасня будзе адкрыта выстаўка-продаж беларускіх тавараў, узяць удзел у якой рыхтуюцца больш за 40 мінскіх прадпрыемстваў. Не забытыя, безумоўна, культурная і спартыўныя праграмы.

Адзін з самых значных праектаў у сяброўстве двух гарадоў — узвядзенне квартала Санкт-Пецярбурга ў Мінску. Па словах **Юрыя КАЧАРГО, першага намесніка старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама**, цяпер ідзе актыўная падрыхтоўка да ажыццяўлення гэтай задумы. Месца размяшчэння будучага квартала — мяжа вуліц Сямашкі і былой вёскі Пятроўшчына. Пляцоўка для будоўлі ўжо расчышчана за кошт бюджэту Мінска. Тут вырастуць дзевяць жылых дамоў — каля 960 кватэр. Гэта будуць восем рознапавярховых дамоў-ветразяў, сярод якіх узвысіцца аднасекцыйны дом-маяк. Дапоўняць комплекс пешаходная зона з лесвічкамі-пандусамі, дэкаратыўны басейн, невялікія кафэ і крамкі. Усё гэта задумана ў стылі гранітнай набярэжнай Санкт-Пецярбурга.

Трэба адзначыць, што ў «паўночнай Пальміры» ў рамках узаемаабмену рыхтуецца будаўніцтва аналагічнага квартала Мінска.

Сяргей КУЛАКОЎ

■

У СЯМ'І СТУДЭНТ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Памеры ўсіх відаў дзяржаўных стыпендый пераглядаюцца ў адпаведнасці з ростам тарыфнай стаўкі першага разраду, якая прымяняецца для аплаты працы ў бюджэтных арганізацыях.

Навучэнцам, якія вучацца на ўзроўні атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі, аказваецца матэрыяльная дапамога.

Ільготы пры аплаце навучання

Гэтыя льготы прапісаны ва Указе Прэзідэнта ад 17.12.2002 № 616 «Аб выдзяленні грамадзянам Рэспублікі Беларусь крэдыту на льготных умовах для аплаты першай вышэйшай адукацыі, якая атрымліваецца ў дзяржаўных установах вышэйшай адукацыі, установах вышэйшай адукацыі спажывецкай кааперацыі і ўстановах вышэйшай адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі на платнай аснове».

Гэтым указам гарантавана права на атрыманне крэдыту **на льготных умовах** для аплаты навучання. Такое права маюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія атрымліваюць у дзяржаўных установах вышэйшай адукацыі, установах вышэйшай адукацыі спажывецкай кааперацыі краіны і ўстановах вышэйшай адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі першую вышэйшую адукацыю на платнай аснове (дзённая форма навучання).

Дадзены крэдыт выдзяляецца студэнту альбо аднаму з яго бацькоў ці іншаму законнаму прадстаўніку студэнта пры наяўнасці пастаяннай крыніцы даходу і з улікам сярэднямесячнага сукупнага даходу на кожнага члена сям'і. За карыстанне крэдытам штомесяц выплачваюцца **працэнты ў памеры 1/2 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка.**

Выдзяленне крэдыту выконваецца ААТ «ААБ Беларусбанк» ва ўстаноўленым парадку часткамі на працягу ўсяго тэрміну атрымання адукацыі ў межах адкрытай крэдытнай лініі.

Вяртанне крэдыту ажыццяўляецца з наступнага месяца пасля заканчэння ВНУ на працягу пяці гадоў.

* * *

Студэнтам і навучэнцам, якія атрымліваюць сярэднюю спецыяльную адукацыю і навучаюцца за кошт уласных сродкаў, прапануюцца **зніжкі па аплаце навучання ў памеры ад 20 да 60 працэнтаў** ад сфарміраванага кошту навучання за навучальны год.

Падстава: пастанова Савета Міністраў ад 26.05.2006 № 665 «Аб зацвярджэнні палажэння аб парадку забеспячэння зніжак са сфарміраванага кошту навучання студэнтам і навучэнцам, якія атрымліваюць сярэднюю спецыяльную адукацыю ў дзяржаўных установах адукацыі, і памерах гэтых зніжак».

Пакрыццё расходаў па найме жылля

Калі не ўдалося забяспечыць месцам у інтэрнаце іншагародніх навучэнцаў і студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, ажыццяўляецца пакрыццё расходаў па найме жылля штомесяц у наступных памерах:

у Мінску — тры базавыя велічыні;

у іншых населеных пунктах — дзве базавыя велічыні.

Права на кампенсацыю расходаў па найме жылля маюць студэнты, калі сярэднедушавы даход іх сем'яў не перавышае 200 % бюджэту пражыткавага мінімуму.

Забеспячэнне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі

Студэнты, якія асвойваюць змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі, на час атрымання адукацыі забяспечваюцца падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі бясплатна.

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

МЫ НІКОЛІ НЕ СУСТРЭНЕМСЯ?

Чаму чалавецтва пакуль не знаходзіць разумнага жыцця ў космасе

Дзе ж гэтыя таямнічыя і нябачныя іншапланецяне? Існуюць яны на самай справе ці іх выдумалі пісьменнікі-фантасты? А можа, яны вельмі добра ад нас хаваюцца?

Складанасць у іх выяўленні можа заключацца ў нас саміх, лічыць група псіхолагаў з Кадыскага ўніверсітэта (Іспанія). У артыкуле навукоўцаў, апублікаваным у часопісе Acta Astronautica, гаворыцца, што мы маглі проста прагледзець прыкметы прысутнасці разумных пазаземных цывілізацый. Прычым у тым няма нічога дзіўнага, паколькі гэта адна з асаблівасцяў работы нашай свядомасці, якая мае навуковае тлумачэнне.

Чалавечы мозг — вельмі складаная і адначасова вельмі дзіўная рэч. Яму даводзіцца штодня апрацоўваць велізарны аб'ём інфармацыі рознага ўзроўню карыснасці. Нярэдка бывае так, што чалавек проста не заўважае таго, што ў яго знаходзіцца проста перад вачыма, таму што яго ўвага ў гэты момант накіравана зусім у іншы бок.

Гэта называецца слепатой няўвагі. Тэрмін быў уведзены ў 1992 годзе навукоўцамі Эрыенам Маркам і Ірвінам Рокам і выкарыстаны як назва іх сумеснай кнігі, апублікаванай у 1998-м. Феномен не адносіцца да праблем са зрокам і носіць выключна псіхалагічны характар. Прычым вельмі мудрагелісты, у чым можна было пераканацца, паглядзеўшы відэа, створанае двума даследчыкамі Даніэлем Сімансам з універсітэта Ілінойса і Крыстаферам Чапрысам з Гарварда. Гэта быў візуальны эксперымент. Задачай падвыпрабавальных было засяродзіцца і падлічыць колькасць пасаў баскетбольнага мяча паміж студэнтамі. З'ява можа быць вызначана як няздольнасць індывіда ўбачыць нейкі раздражняльнік, які нечакана ўзнікаў у поле зроку, як, напрыклад, чалавека ў касцюме гарылы, які з'яўляецца, а затым зноў знікае з кадра. Хтосьці заўважыў гарылу? Яго можна павіншаваць. Тады, можа быць, яшчэ ён заўважыў, як па ходзе ролика мяняўся колер фіранак, а яшчэ адна дзяўчына ў чорным пакінула кадр? Не? Значыць, відэа варта перагледзець яшчэ раз.

Псіхолагі з Кадыскага ўніверсітэта вырашылі правесці яшчэ адзін эксперымент з гарылаю, каб наглядна прадэманстраваць, чаму навукоўцы па-ранейшаму не знайшлі ніякіх прыкмет разумнага пазаземнага жыцця. «А што, калі прычына, якая перашкаджае выкананню гэтай навуковай задачы, схаваная ў чалавечым фактары або біяпсіхалагічных асаблівасцях нашага мозга?» — задаюцца пытаннем псіхолагі Габрыэль дэ ла Торэ і Мануэль Гарсія.

Для праверкі сваёй ідэі даследчыкі запрасілі паўдзельнічаць у простым эксперыменце на праверку кагнітыўных здольнасцяў 137 добраахвотнікаў. Перад удзельнікамі была пастаўлена задача адказаць на тры пастаўленыя пытанні. Вынікі тэсту павінны былі паказаць, якая колькасць людзей будзе мець схільнасць даваць хуткія адказы, фактычна не задумваючыся аб іх (гэтых людзей навукоўцы аднеслі да «першай групы»), а якая — больш уважліва падыходзіць да вырашэння гэтых трох пытанняў («другая група»).

Пасля завяршэння тэста і запаўнення анкет, дзякуючы якім даследчыкі змаглі вызначыць узровень увагі кожнага чалавека, удзельнікаў папрасілі ўважліва праверыць прапанаваныя аэраздымкі паверхні нашай планеты і адзначыць на іх штучныя структуры накшталт будынкаў, а таксама натуральныя аб'екты накшталт рэк і горных хрыбтоў. Аднак на адной з фатаграфій мелася малюсенькая, памерам тры міліметры, гарыла. Як чакалі даследчыкі, прадстаўнікі «другой групы» падвыпрабавальных павінны былі заўважаць «утоеную» фігуру гарылы часцей, чым прадстаўнікі «першай», аднак вынікі аказаліся яшчэ больш уражальнымі. Наогул сярод усіх удзельнікаў эксперымента знайшлі гарылу на здымку толькі 32,8 % людзей, пры гэтым амаль усе яны прадэманстравалі ўзровень кагнітыўнай увагі «першай групы», гэта значыць яны абапіраліся на «больш імпульсіўны/інтуітыўны метад успрымання інфармацыі».

«Падобна на тое, што засяроджанасць на пэўным метадзе пошуку, напрыклад пошуку радыёсігналаў пазаземнага паходжання, можа асляпіць нас і аддзяліць ад іншых магчымых варыянтаў», — паведамляюць даследчыкі ў сваіх высновах. «Людзі могуць не заўважаць падмаляваную гарылу на здымку. Пытанне ў тым, колькі ўжо «гарыл» мы маглі выпусціць з-пад увагі пры пошуку прыкмет пазаземнага жыцця?»

Акрамя нагадвання астраномам пра такі феномен, як слепата няўвагі, псіхолагі ў сваёй працы прапануюць увядзенне новай класіфікацыі для магчымых разумных пазаземных цывілізацый. Выйшаўшы за рамкі знакамітай шкалы Кардашава — метаду, які прапануе ацэньваць цывілізацыі па тым, колькі энергіі яны могуць выкарыстоўваць для сваіх патрэб, — псіхолагі з Кадыскага ўніверсітэта гавораць аб магчымасці існавання больш разнастайных відаў цывілізацый: пачынаючы ад эфемерных, якія жывуць толькі нязначную колькасць часу, і заканчваючы зусім ужо фантастычнымі, якія валодаюць магчымасцю «шматмерных падарожжаў і выкарыстоўваюць у якасці крыніцы энергіі цёмную матэрыю».

Дадзенае даследаванне не прапануе нейкіх новых метадаў выяўлення пазаземных формаў жыцця, але цалкам даступна тлумачыць, як «касмічная гарыла» здольная заблытаць нам усе карты і прымусіць глядзець не ў той бок.

Вядома ж, ёсць і іншыя тлумачэнні, чаму чалавецтва дагэтуль чакае першага кантакту. Цалкам магчыма, што гэта проста пытанне часу. Можа быць і так, што пазаземныя цывілізацыі прадстаўленыя толькі мікробным формамі жыцця альбо знаходзяцца так далёка, што сігналы ад іх да нас яшчэ проста не дайшлі.

■ Ну і ну!

З АДХОДАЎ ПІВАВАРСТВА — ДАМЫ НА МАРСЕ

Няма сумненняў, што кіраваная місія на Марс рана ці позна адбудзецца і першым пасяленцам трэба будзе дзесьці жыць. Пры гэтым матэрыял для дамоў павінен быць трывалым, недарагім і вытрымліваць жорсткія ўмовы чырвонай планеты. І так атрымалася, што сыравіна для такога матэрыялу была знойдзена. Прычым не ў высокатэхналагічных лабараторыях, а на заводзе па вытворчасці піва.

Як паведамляе выданне Nano Energy, групе даследчыкаў з каларадскага ўніверсітэта (ЗША) на чале з Іванам Смалюхом удалося распрацаваць танны аэрагель. Аэрагель — гэта матэрыял з цвёрдым каркасам і вялікай (да 90 %) колькасцю поласцяў з бурбалкамі паветра ці іншага газу. Дзякуючы гэтаму аэрагель вельмі лёгкі, на яго вытворчасць ідзе мала сыравіны, а з-за асаблівай будовы каркаса жорсткасць канструкцыі атрымліваецца дастатковай для таго, каб выкарыстоўваць аэрагель у якасці будматэрыялу. Акрамя ўсяго іншага, матэрыял валодае добрымі цеплаізаляцыйнымі ўласцівасцямі і праз яго пранікае сонечнае святло. Але ёсць і недахоп: аэрагель матавы з-за хаатычнай унутранай структуры. Менавіта апошнюю ўласцівасць і вырашыла змяніць каманда навукоўцаў.

Асновай каркаса новага віду аэрагелю з'яўляецца цэлюлоза. Яе вельмі шмат у адходах піваварства — піўным сусле, якое на дадзены момант проста ўтылізуецца. Такім чынам, атрымліваць «касмічны будматэрыял» можна зусім за капейкі. Некаторыя заводы будуць толькі рады, калі іх пазбавяць ад велізарнай колькасці адпрацаванага матэрыялу.

У працэсе апрацоўкі сусла спецыяльны від аэробных бактэрый перапрацоўвае яго ў нанаініткі цэлюлозы, у выніку чаго атрымліваецца празрыстая гнуткая плёнка, прычым цеплаўстойлівасць такога матэрыялу настолькі высокая, што яго без праблем можна памясціць на некаторы час у агонь. Аўтары лічаць, што новы матэрыял можна выкарыстоўваць пры касмічных місіях. «Празрысты, лёгкі і трывалы ўцяпляльнік дапамог бы, напрыклад, марсіянскім каланістам. Вы можаце «сабраць» сонечнае святло, якое праходзіць праз цеплаізаляцыйнае акно, і захаваць цяпло ўнутры памяшкання, пазбягаючы пераахаладжэння і не затрачваючы рэсурсы на абагравание памяшканняў на Месяцы або Марсе».

Акрамя гэтага, матэрыял можа спатрэбіцца і на Зямлі для вырабу цеплазберагальных вокнаў і нават, па прызнанні аўтараў, празрыстага зімовага адзення. Апошняе гучыць вельмі дзіўна, але, улічваючы экстравагантныя тэндэнцыі сучаснай моды, чаму б і не?

■ Дайджэст

Брытанія будуе свой першы касмадром...

Усё больш дзяржаў уключаецца ў касмічную гонку. Нядаўна стала вядома, што пасля больш чым 10 гадоў абмеркаванняў урад Вялікабрытаніі вырашыў пабудаваць першы ў краіне касмадром.

Месцам размяшчэння будучага аб'екта была абраная акруга Сатэрлэнд, паўвостраў A'Mhoine ў Шатландыі. Плато было абрана не выпадкова, бо гэта забалочаная і маланаселеная мясцовасць, а само яно выдатна падыходзіць для вертыкальных запускаў невялікіх спадарожнікаў. За будаўніцтва адказвае дзяржаўнае агенцтва па пытаннях развіцця Highlands and Islands Enterprise. Як заявіў міністр эканомікі Вялікабрытаніі Грэг Кларк, для першага этапу будаўніцтва дзяржава выдзеліць 2,5 мільёна фунтаў, агульны ж кошт праекта на дадзены момант ацэньваецца ў 50 мільёнаў фунтаў.

Што да асноўнага роду дзейнасці, то з касмадрома будзе праводзіцца пуск малагабарытных ракет, якія будуць здольныя выводзіць на арбіту малыя спадарожнікі. Апошнія будуць выкарыстоўвацца для інтэрнэт-камунікацый, маніторынгу за надвор'ем, навігацыі і г. д. Акрамя вертыкальнай стартавай пляцоўкі, таксама будзе створана і ўзлётна-пасадачная паласа, з якой будуць стартаваць мадыфікаваныя камерцыйныя самалёты для перакідвання спадарожнікаў. Што цікава, будаўніцтва касмадрома ў Шатландыі плануецца завяршыць ужо ў 2020 годзе.

...Кітай — міжнародную касмічную станцыю

А ў Кітаі пачалося будаўніцтва новай касмічнай станцыі. Эксперты называюць гэта апошнім крокам у распачатай касмічнай гонцы дзяржаў. Пасол Кітая ў ААН Шы Чжунцзюнь запрасіў увесь свет прыняць удзел у праекце. «ККС належыць не толькі Кітаю, і ўсе краіны, незалежна ад іх памеру і ўзроўню развіцця, могуць супрацоўнічаць на роўных умовах», — сказаў ён.

Новая касмічная станцыя можа пачаць работу ўжо пасля 2022 года, паводле дакументаў, апублікаваных Упраўленнем ААН па космасе. Яна павінна функцыянаваць каля дзесяцігоддзя і падтрымліваць знаходжанне на ёй шасці астранаўтаў на тэрмін да 180 дзён. Будаўніцтва некаторых частак ужо завершана. Асноўны модуль атрымаў назву «Цяньхэ-1», або «Гармонія нябёсаў», ён будзе адпраўлены на арбіту ў 2020 годзе.

Вядома, што ЗША забаранілі касмічнаму агенцтву Кітая выкарыстоўваць МКС з меркаванняў бяспекі. Аднак МКС не вечная, і адміністрацыя Трампа разглядае магчымасць спынення работы ЗША на МКС да 2025 года. NASA ўжо выдатковала каля 100 мільярдаў долараў на захаванне МКС, якая функцыянуе як арбітальная лабараторыя для навукоўцаў і астранаўтаў. Ужо цяпер многія з тых, хто стаяў за падтрыманнем МКС, інвестуюць у кітайскую касмічную станцыю.

...Toyota — робата для космаса

Японская кампанія Toyota — адзін з найбуйнейшых у свеце аўтавытворцаў, але ў сферу інтарэсаў карпарацыі ўваходзіць яшчэ шмат чаго. Напрыклад, нядаўна прадстаўнікі кампаніі з Краіны ўзыходзячага сонца прадставілі чалавекападобнага робата T-HR3 як магчымага механічнага памочніка для заваявання космасу.

На самай справе сфера прымянення робата T-HR3 распаўсюджваецца не толькі на касмічную прастору. Ён можа знайсці прымяненне і на Зямлі ў якасці робата для ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый і катастроф, у месцах з вельмі нізкімі і высокімі тэмпературамі і высокім радыяцыйным фонам.

T-HR3 мае вельмі добрую каардынацыю рухаў. Для кіравання машынай выкарыстоўваецца віртуальная рэальнасць. На дадзены момант Toyota не наладзіла прамысловую вытворчасць, але ўжо ў найбліжэйшай будучыні японцы хочуць паставіць стварэнне такіх робатаў на паток. Акрамя гэтага, карпарацыя вядзе і распрацоўкі ў сферы штучнага інтэлекту, таму нельга выключаць, што новыя мадэлі T-HR3 навучацца абыходзіцца без дапамогі чалавека. Прадстаўнікі Toyota ўжо выклалі ў інтэрнэт відэа з дэманстрацыяй функцыянавання робата

БЕРАГ ЛЕВЫ, БЕРАГ ПРАВЫ...

Калі б не было гэтай паромнай пераправы, то жыхарам Лунінецкага раёна прыйшлося б туга: каб трапіць на супрацьлеглы бераг, давялося б пераадольваць сто з гакам кіламетраў. Тое самае датычыцца і жыхароў суседняга — Столінскага раёна.

Вёска з французскай назвай Кораб'е — знакавы населены пункт для многіх тутэйшых і нетутэйшых аўтамабілістаў, матацыклістаў, веласіпедыстаў, фурманаў і пешых вандроўнікаў. Вёска ляжыць на правым беразе Прыпяці, і менавіта каля яе паром замяняе кавалак рэгіянальнай — кароткай і надзвычай важнай — дарогі, якая вядзе з Лунінца да Століна. Адзін з самых сучасных і надзейных паромаў працуе бездакорна, нібы швейцарскі гадзіннік. Своечасова, па раскладзе, адпраўляецца і праз дзесяць хвілін прычальвае на прыстань другога берага. Робіць у дзень па дзесяць рэйсаў у кожны бок, можа ўзяць на борт некалькі грузавікоў альбо дзясятак легкавікоў. Паром буксіруе транспартны катар.

Доўгі час паром у Кораб'і не дзейнічаў. На супрацьлеглы бок перапраўляліся на лодках. І толькі ў 2012-м дзякуючы дэпартаменту «Белаўтадар», а менавіта Лунінецкаму дарожна-рамонтна-будаўнічаму ўпраўленню № 101, пераправа, узведзеная па дзяржаўнай праграме развіцця Прыпяцкага Палесся, зноў запрацавала.

Цяпер паром, грузападымальнасць якога разлічана на 60 тон, абслугоўваюць дзве змены, па тры чалавекі ў кожнай — матарыст і два матросы. Мне давялося пазнаёміцца з камандай, у якой абавязкі матросаў ужо пяты год выконваюць Генадзь Цюшкевіч і Уладзімір Захаранка. А матарыст, ён жа і капітан-механік — Мікалай Шэўчык. Мікалай Пятровіч некалі працаваў боцманам на Далёкім Усходзе, а потым, у сталым узросце, вучыўся ў Гомельскім рачным вучылішчы кіраваць катарам. Нядаўна да выканання абавязкаў начальніка пераправы «Лунінец» прыступіў Яўген Рафаловіч, які перад гэтым працаваў энергетыкам у ДРБУ-101. Усе яны — начальнік, матарыст і два матросы — на адным з гэтых здымкаў.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

РАСПИСАНИЕ
движения паромной переправы
с 01.04.2016 года

с Лунинца	со Столина
7 00	7 30
8 00	8 30
9 00	9 30
10 00	10 30
12 00	12 30
14 00	14 30
16 00	16 30
17 30	18 00
19 00	19 30
20 00	20 30

Гл. инженер ДРСУ № 101 В.Я.Кузьмич

Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ООО «Терминал-75», г. Минск, ул. Передовая, 6, здание административно-хозяйственное с инв. № 500/С-49451, помещение № 201

Предмет аукциона
Месторасположение: г. Минск, ул. Передовая, д. 6

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инв. номер
Лот № 1		
Здание административно-хозяйственное	2390,4 кв. м	500/С-49451

***Сведения о земельных участках*: предоставлен продавцу пл. **0,0708 га** на праве аренды (срок действия по 28.02.2020) и **0,1659 га** на праве аренды (срок действия по 28.02.2054) для размещения объектов административного назначения с установленными ограничениями (охранные зоны линий электропередачи, сетей и сооружений канализации, водоснабжения теплоснабжения)**

Обременения: частичная аренда. Подробности на сайте организатора аукциона www.cpo.by

Начальная цена лота № 1 без НДС – 1 476 263,23 бел. руб.

Лот № 2		
Здание специализированное для производства строительных материалов	3526,1 кв. м	500/С-41629

***Сведения о земельном участке*: пл **1,1105 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для производства строительных материалов с установленными ограничениями (охранные зоны электрических сетей, сетей и сооружений водоснабжения, канализации, теплоснабжения)**

Обременения: частичная аренда. Подробности на сайте организатора аукциона www.cpo.by

Начальная цена лота № 2 без НДС – 2 177 648,84 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Аукцион состоится 17.10.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 15.10.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**

Утерянный представительством Белгосстраха по Октябрьскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВВ № 5246752 **считать недействительным.**

УНП 100122726

ОАО «Амкодор-Белвар»
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущественного комплекса ДОЦ «Доманово» на электронной торговой площадке РУП «Информационный центр Минэкономики» по адресу torgi.gov.by

Торги проводятся в течение 14 календарных дней.
Дата начала торгов – 17 сентября 2018 г.

УНП 100363840

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29

Предмет аукциона

Помещение банка, общ. пл. **137,1 кв. м**, инв. № **630/D-41142**, по адресу: **Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 80В-1.** Начальная цена с НДС 20 % **– 182 623,99 бел. руб.**

Обременение: частичная аренда. Подробная информация на сайте организатора торгов www.cpo.by

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **20** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.

Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.

Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

При приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества на сумму 6 333,10 бел. руб. с последующим доначислением НДС.

Состав имущества размещен на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Для целей размещения банкомата покупатель обязуется заключить с банком договор аренды части помещения сроком не менее трех лет. Банк вправе отказаться от заключения договора аренды

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**15.10.2018** в 14.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**11.10.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Барановичский завод автоматических линий»

Предмет торгов	Начальная цена, руб. (без учета НДС)	Размер задатка
Лот 1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-87501 пл. 3807,6 кв. м (назначение: здание специализированное для обработки древесины, наименование: деревообрабатывающий корпус), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003639 пл. 1,6024 га по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Королика, 8/19. Составные части и принадлежности: четыре навеса, внутриплощадочные автодороги и промплощадки, ввод хозяйственно-питьевого водопровода, выпуск канализации, ввод газопровода. 2) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-114210 пл. 318,6 кв. м (назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование: здание пилорамы с эстакадой), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003639 пл. 1,6024 га по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Королика, 8/18. Составные части и принадлежности: подвал, эстакада. 3) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-87533 пл. 29,4 кв. м	**251 520,00**	**25 152,00**

Условия продажи	Без условий
Организатор торгов	Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Номер р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245

Аукцион состоится 16 октября 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

